

Згодна са змяненнямі, з унесенымі ў Правілы перавозак пасажыраў і багажу чыгуначным транспартам агульнага карыстання, забаронена курэнне ва ўсіх цягніках, акрамя міжнародных. СТАР. 3



Выпадкі махлярства з выкарыстаннем паслуг сувязі ў наш час не рэдкасць. Больш за тое, з развіццём тэхналогій з'яўляюцца ўсе новыя схемы адабрання грошай у карыстальнікаў сотавай сувязі. СТАР. 3



Як мяркуюць эксперты, у нашай кінадакументалістыцы склалася школа. Таму побач даволі гарманічна суіснуюць розныя пакаленні рэжысёраў. І ў кожнага відавочныя адметнасці стылю. СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 СТУДЗЕНЯ 2013 г. СУБОТА № 11 (27376) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

### Работнікам і ветэранам органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях

*Паважаныя таварышы!*

*Ад усёй душы віншую вас з прафесійным святам — Днём выратавальніка!*

*Грамадства высока цэніць самаадданасць тых, хто пастаянна знаходзіцца на баявым пасту і гатовы рызыкаваць уласным жыццём у імя выратавання іншых.*

*Мужнасць і гатоўнасць да самаахвяравання з'яўляюцца адметнымі рысамі многіх пакаленняў выратавальнікаў. За час сваёй службы, звязанай з трывогамі і небяспекай, вы неаднойчы дэманстравалі вытрымку, стойкасць і адвагу.*

*Сёння органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях маюць магутны патэнцыял і здольны на высокім узроўні вырашаць пастаўленыя задачы.*

*Упэўнены, што вы і ў далейшым будзеце ўзорам адданага служэння сваёй краіне і свайму народу.*

*У гэты святочны дзень шчыра зычу вам новых поспехаў у гэтай адказнай службе, а таксама моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту вам і вашым блізкім.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## СТРУКТУРА ОРГАНАЎ ПРАКУРАТУРЫ І СЛЕДЧАГА КАМІТЭТА БЕЛАРУСІ БУДЗЕ АПТЫМІЗАВАНА

**Аптымізацыя структур органаў пракуратуры і Следчага камітэта абмеркавана 18 студзеня на рабочай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі Леанідам Мальцавым, кіраўнікамі Генпракуратуры і Следчага камітэта Аляксандрам Канюком і Валянцінам Шаевым.**

«Мы дамаўляліся з вамі, што ў першых чыслах гэтага года вернемся яшчэ раз да разгляду аптымізацыі структур органаў пракуратуры і ствараемага Следчага камітэта, — адзначыў Прэзідэнт. — Вы абяцалі, што сёння далажыце аб тым, як мы будзем аптымізаваць, у тым ліку органы пракуратуры, — яны не павінны застацца ўбаку. Мы разглядалі абласныя цэнтры, нават горад Мінск, дзе мы можам аб'яднаць некаторыя пракуратуры».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, неабходнасць аптымізацыі ў тым ліку звязана са змяненнем функцый пракуратуры пасля стварэння Следчага камітэта. Аднак і ў працэсе фарміравання гэтага новага ведамства высветлілася, што магчыма адмовіцца ад некаторых залішніх структур. Кіраўніку дзяржавы было далажана аб тым, як рэалізуюцца гэтыя пытанні.

«Адзінае, аб чым папярэджваю, — ні ў якім выпадку не цягнуць коўдру на сябе, ні ў Генеральнай пракуратуры, ні ў Следчым камітэце, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Трэба зыходзіць з таго, быццам бы вы стварaеце сваё асабістае прадпрыемства або арганізацыю, дзе не павінна быць лішніх людзей, і каб не было трат дзяржаўных грошай. Мы павінны знаходзіцца ў рэчышчы той аптымізацыі, якая сёння разгорнута па дзяржаўных служачых».

Паводле слоў Аляксандра Канюка, па шляху аб'яднання асобных пракуратур плануецца пайсці ў Гродне, Брэсце, Магілёве, Віцебску, а таксама гарадах абласнога падпарадкавання, такіх, напрыклад, як Полацк, Орша і Пінск. Асобна будзе вырашана пытанне з Гомелем і Мінскам.

Аналагічны прынцып пры аптымізацыі будзе прымяняцца і да Следчага камітэта. Перад Аляксандрам Канюком і Валянцінам Шаевым пастаўлена задача сумесна рэалізаваць гэтыя планы на падставе адзінай канцэпцыі.

Акрамя таго, Аляксандру Лукашэнку было далажана аб крымінагеннай сітуацыі ў Беларусі. Значна зменшылася колькасць забойстваў, цяжкіх цялесных пашкоджанняў. На чвэрць знізілася колькасць разбояў. У цэлым статыстыка сведчыць аб зніжэнні па выніках года колькасці зарэгістраваных злачынстваў больш як на 22 працэнты.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ПЁТР ПРАКАПОВІЧ НАЗНАЧАНЫ ВІЦЭ-ПРЭМ'ЕРАМ БЕЛАРУСІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў Пятра Пракаповіча намеснікам прэм'ер-міністра, вызваліўшы яго ад пасады памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

На Пятра Пракаповіча ўскладзена адказнасць за забеспячэнне выканання важнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, выканання рэспубліканскага бюджэту і ажыццяўлення мерапрыемстваў па мадэрнізацыі беларускай эканомікі. Таксама кіраўнік дзяржавы вызваліў Мікалая Корбута ад пасады кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі ў сувязі з пераходам на іншую работу. Адпаведныя ўказы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 18 студзеня.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ГУЛЯЙ, ГРАМАДА! БЫВАЙ, КАЛЯДА!





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Дзве палескія вёскі, Тонеж і Іванава Слабада, — спрадвечныя суседкі. Адлегласць паміж імі ўсяго 9 кіламетраў. Яны такія падобныя, як сёстры — і ў побыце, і нават у сваіх лёсах. Гаворкі, манеры паводзін людзей, рысы характару — як з адной сям'і. Спеўны народ і тут, і там, умелы, што ні хата — вышывальшчыцы. Нават трагічныя падзеі гэтых вёсак амаль аднолькавыя — у вайну яны былі спалены нямецкімі карнікамі на самыя Каляды.**

Аднак цікава, што песні адных і тых жа абрадаў, як ні дзіўна, розняцца. Гэта, безумоўна, вабіць у палескі куток даследчыкаў фальклору і шукальнікаў цікавых традыцый. Цікавасць да духоўнай спадчыны Тонежа і Слабады расце невыпадкова. Гэтыя два астраўкі сярод лясоў Лельчыцкага краю з'яўляюцца носьбітамі і захавальнікамі старажытных і вельмі адметных абрадаў. Сярод іх і Каляды. Наш карэспандэнт Анатоль Кляшчук стаў сведкам шчадравання — у адзін вечар яму ўдалося пабегаць разам з тонежскімі калядоўшчыкамі і паспець да слабодскіх. Убачыць розніцу манер ваджэння каляднай казы і пачуць адметнасці выканання шчадроўскіх песень. СТАР. 3

## УСЕ БУДАЎНІЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ БЫЦЬ РЭЗІДЭНТАМІ БЕЛАРУСІ

**Усе арганізацыі, якія ажыццяўляюць будаўніча-мантажныя, праектныя работы, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў і канструкцый, павінны быць рэзідэнтамі Беларусі. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, заслухаўшы справаздачу міністра архітэктуры і будаўніцтва Анатоля Нічкасава, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Міхаіл Мясніковіч выставіў такое ж патрабаванне і да арганізацый транспарту, сувязі і іншых галін. Мінбудархітэктуры, аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму сумесна з МЗС і зацікаўленымі ведамствамі даручана вырашыць гэта пытанне. «Мноства арганізацый, якія не з'яўляюцца рэзідэнтамі Беларусі, аказваюць у краіне свае паслугі. Яны не плацяць у рэспубліцы падаткі, не вядуць адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Гэтыя паслугі не ўлічваюцца ў ВУП краіны», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Прэм'ер-міністр даручыў Мінбудархітэктуры эфектыўна арганізаваць работу па ўзвядзенні ў краіне арэнднага жылля. У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта павінны быць рэалізаваны праекты па ўзвядзенні такога жылля для вучоных. Напрыклад, у Мінску плануецца пабудаваць для іх два арэндныя дамы — гэта 500 кватэр.

## 6 БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПАСПРАБУЮЦЬ АТРЫМАЦЬ ПРЭМІЮ СНД ЗА ЯКАСЦЬ

**Рэспубліканская конкурсная камісія вызначыла фіналістаў для ўдзелу ў другім этапе конкурса на атрыманне Прэміі Садружнасці Незалежных Дзяржаў за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг 2012-2013 гадоў, паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі.**

У ліку прэтэндэнтаў на перамогу ў намінацыі «Вытворчасць прадукцыі вытворчага назначэння» — прадпрыемствы «Краснасельскбудматэрыялы» і «Гомсельмаш». У намінацыі «Вытворчасць тавараў народнага спажывання» — СТАА «Контэ Спа» (г. Гродна). У намінацыі «Вытворчасць харчовых тавараў і сельскагаспадарчай прадукцыі» — ТАА «Бабулін гладыш» — кіруючая кампанія холдынга «Магілёўская малочная кампанія «Бабулін гладыш» і ААТ «Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат». У намінацыі «Паслугі» — Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека (г. Гомель). Далейшая барацьба будзе праходзіць з прэтэндэнтамі з Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Украіны. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены напрыканцы 2013 года.

**Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

*Прэмія СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг прысуджаецца адзін раз на два гады на конкурснай аснове арганізацыям дзяржаў — удзельніц Садружнасці за значныя вынікі ў галіне якасці прадукцыі (паслуг), забеспячэнне яе бяспекі, а таксама ўкараненне сучасных метадаў менеджменту якасці. Прымаць удзел могуць юрыдычныя асобы любой арганізацыйна-прававой формы.*

### ЛІЧБА ДНЯ

**Br2 млн 736,6 тыс.**

***дасягнулі грашовыя даходы ў месяц у разліку на душу насельніцтва ў студзені-лістападзе 2012 года, паводле статыстычных даных, і перавысілі бюджэт пражытковага мінімуму ў 3,4 раза. Агульны аб'ём грашовых даходаў насельніцтва Беларусі за гэты перыяд склаў Br284,8 трлн. У структуры грашовых даходаў аплата працы займае 63,9%, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 10,1%, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і інш.) — 21,5%, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 4,5%.***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 8° |
| Віцебск | – 13° |
| Гомель | – 7° |
| Гродна | – 10° |
| Магілёў | – 10° |
| Мінск | – 11° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.01.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8650,00 | ■ |
| Еўра | 11460,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 284,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1060,92 | ▼ |

### КОРАТКА

Замежныя грамадзяне сталі часцей звяртацца ў Беларусь з хадайніцтвамі аб прадастаўленні статусу бежанца або дадатковай абароны. Летась, з ліку кандыдатаў, якія звярнуліся з хадайніцтвамі, грамадзяне Афганістана склалі 54,7 працэнта ад агульнай колькасці тых, хто звярнуўся, Сірыі — 13,2, Грузіі — 10,4, Егіпта — 3,8, Расіі і Украіны — па 2,8. Таксама звярталіся грамадзяне Пакістана, Азербайджана, Арменіі, Ірана, Кот-д'Івуара, Лівана, Польшчы, Таджыкістана, Шры-Ланкі, Эрытрэі, Эфіопіі і Эстоніі.

«Белтэлекам» з 18 студзеня павысіў кошт паслуг прадастаўлення доступу ў Інтэрнэт (byfly) і інтэрактыўнага тэлебачання (Zala). Цэны на паслугі інтэрнэт-доступу павялічыліся ў сярэднім на 9,7 працэнта. Аднак на некаторых папулярных тарыфных планах яны павялічыліся больш як на 20 працэнтаў.

На падставе Правіл вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства і Палажэння аб Мінпрыроды ўстанаўліваецца забарона на аматарскае рыбалоўства на ўчастку Нёмана ад плаціны Гродзенскай гідраэлектрастанцыі на адлегласці 1 тыс.м уніз па цячэнні ракі да месца ўпадзення безыменнага ручая ў Нёман па 1 ліпеня 2013 года і штогод з 1 снежня па 1 ліпеня.

Дар'я Домрачава заняла трэцяе месца ў спрынце на шостым этапе Кубка свету па біятлоне ў італьянскім Антхольцы. Пераможцай стала Настасся Кузьміна са Славакіі, другое месца ў фінкі Кайсы Мякярайнен.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ДЗЯРЖДУМА РФ УХВАЛІЛА ЗАКОН АБ ШТРАФАХ ЗА МАТ У СМІ

Дэпутаты Дзярждумы прынялі ў першым чытанні законапраект, які ўстанаўлівае штрафы за нецэнзурную лексіку ў СМІ. Праект прадугледжвае ўвядзенне штрафаў у памеры ад 20 да 200 тысяч расійскіх рублёў для юрыдычных асоб, ад 5 да 20 тысяч — для службовых асоб і ад 2 да 3 тысяч рублёў — для звычайных грамадзян. За ініцыятыву прагаласавалі 390 дэпутатаў, галасоў супраць ці тых, хто ўстрымаўся, не было.

### ЕЎРАКАМІСАР ПА ПАДАТКАХ ПРАД'ЯВІЎ ШВЕЙЦАРЫІ УЛЬТЫМАТУМ

У Швейцарыі ёсць паўгода на тое, каб прывесці свае падатковыя рэжымы ў адпаведнасць з нормамі Еўрасаюза, інакш асобныя краіны могуць ужыць да Берна санкцыі. Пра гэта еўракамісар па падатках Альгірдас Семета заявіў у інтэрв'ю швейцарскай Le Temps. Еўракамісар паведаміў, што перамовы са Швейцарыяй працягваюцца. Еўрапейскія ўлады хочуць дамагчыся ад Берна



змены сямі падатковых рэжымаў — трох кантанальных і чатырох федэральных. Усе яны тычацца падаткаабкладання прадпрыемстваў. У рамках дзейнай схемы Швейцарыя выступае за захаванне звестак сваіх кліентаў у тайне. Берн лічыць, што швейцарскія ўлады самі змогуць абкладаць падаткамі даходы замежных кліентаў і адпраўляць сродкі на радзіму ўкладчыка. Семета адзначыў, што прадастаўленне Швейцарыі асаблівых умоў пры адкрытым рынку наносіць шкоду іншым удзельнікам Еўрасаюза.

### КЭМЕРАН ЗБІРАЕЦЦА ЎКАЗАЦЬ НА НЕАБХОДНАСЦЬ РЭФАРМАВАЦЬ ЕС

Прэм'ер Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран лічыць, што ЕС варта ўзяцца за вырашэнне ключавых праблем, калі ён хоча пазбегнуць распаду, піша «Гардыян». На думку Кэмерана, тры галоўныя выклікі, з якімі сутыкаецца ЕС — пазыковы крызіс зоны еўра, канкурэнтаздольнасць, якая пагаршаецца, і скарачэнне падтрымкі Еўрасаюза з боку грамадства. «Калі мы не накіруем нашы сілы на гэтыя выклікі, то Еўропа пацерпіць няўдачу, брытанцы будуць схіляцца да выхаду з ЕС», — гаворыцца ў тэксце выступлення Кэмерана, вытрымкі з якога прыводзяць мясцовыя СМІ. У апублікаваных урыўках прамовы Кэмерана няма згадак пра раней агучаную прэм'ерам ідэю аб правядзенні ў Вялікабрытаніі рэферэндуму аб тым, ці варта краіне заставацца ў Еўрасаюзе.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ФРАНЦЫЯ МАРНУЕ ПА 400 ТЫС. ЕЎРА Ў ДЗЕНЬ НА АПЕРАЦЫЮ Ў МАЛІ

**Удзел вайскоўцаў арміі Францыі ў барацьбе супраць мяцежнікаў у Малі абыходзіцца ў 400 тыс. еўра за суткі, паведамляе французскі тэлеканал «БФМ» са спасылкай на ацэнкі неназваных экспертаў.**

Афіцыйных звестках аб выдатках пакуль не паступала. Часопіс «Экспрэс» падкрэслівае, што яны з'явяцца толькі пасля заканчэння аперацыі ў Малі. Удзел у 2011 годзе ў сямімесячнай аперацыі ў Лівіі абышоўся Францыі ў 368,5 млн еўра, гэта значыць, прыкладна ў 1,7 млн еўра за дзень. А на ваенную аперацыю ў Афганістане за 2012 год Парыж выдаткаваў 493 млн еўра (1,3 млн еўра ў дзень).



«Экспрэс» падкрэслівае, што аперацыі французскай арміі ў Малі пакуль значна менш маштабныя, чым у Лівіі і Афганістане. Таму і штодзённыя выдаткі павінны быць меншымі.

Выдаткі за адну гадзіну палёту знішчальніка «Рафаль» ацэньваюцца ў прыкладна 26,8 тыс. еўра. Выкарыстанне самалёта «Міраж» абыходзіцца ў 11,7 тыс. еўра за адну гадзіну.

**У Беларусі на тысячу шлюбаў прыпадае ажно 492 разводы. Такія звесткі за 11 месяцаў 2012 года прыводзіць Нацыянальны статыстычны камітэт.**

## ШТО ЗРАБІЦЬ, КАБ У НАШАЙ КРАІНЕ СТАЛА МЕНШ РАЗВОДАЎ?



**Людміла ГУЦЬКО, дырэктар адаптацыйна-аздараўленчай установы «Востраў надзеі»:**

— Па-першае, самі маладыя павінны ўяўляць, для чаго яны сышліся, як яны будуць будаваць сям'ю, што гэта адзін раз і на ўсё жыццё. І тут важную ролю адыгрывае выхаванне. Не перашкодзіла б у школах увесці такі прадмет, як сем'язнаўства. Людзі за мяжой гэтаму шмат увагі надзяляюць, у нас жа будучых мужа і жонку не рыхтуюць да стварэння сям'і, не вучаць падатлівасці, уменню ісці на кампраміс, без якіх у сямейным жыцці ну ніяк. Па-другое, вельмі важны ў гэтай сітуацыі і эканамічны складнік. Добра б было, каб дзяржава давала магчымасць маладым сем'ям будаваць уласнае жыллё з прывязкай да іх заробкаў. А на першы час выдзяляла ім даступнае часовае арэнднае жыллё таксама па прымальных коштах. Умацоўвае шлюбы, па маіх назіраннях, і абрад вянчання.



**Аляксандр АЛЕСІК, прэс-сакратар Беларускага металургічнага завода:**

— Сёння людзям прасцей паставіць крыж на былым каханні, пазбавіць магчымасці сваё дзіця расці ў паўнацэннай сям'і, чым вырашыць нейкія праблемы ва ўзаемаадносінах. Большасць проста не ўмеюць выстройваць зносіны. Каб выправіць гэту сітуацыю, я ўвёў бы для старэйшых класаў факультатыў, на якім псіхолаг тлумачыў бы дзецям, як патрэбна ладзіць узаемаадносіны, выходзіць з канфліктных сітуацый. Вельмі важна, каб гэтыя заняткі мелі не тэарэтычны, а практычны напрамак. Прычым патрэбна не толькі мадуляваць канкрэтныя сітуацыі, але і дапамагчы кожнаму вызначыць яго асабісты тып характару і навучыць згладжваць існуючыя недахопы. У дадатак у праграму па літаратуры дабавіў бы больш твораў, якія адлюстроўваюць ролю сям'і ў жыцці чалавека.



**Вольга МАЦЮХОВА, псіхолаг аддзялення дапамогі сям'і ў крызіснай сітуацыі Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей:**

— Стварыць сям'ю лёгка, пражыць разам усё жыццё — вялікая праца. Многія маладыя людзі не ўсведамляюць адказнасць за свае дзеянні пры ўступленні ў шлюб. Больш за тое, яны памылкова робяць стаўку на тое, што пасля ўступлення ў шлюб змогуць змяніць свайго партнёра. Праблема ў тым, што ў нашай краіне не вучаць, як жыць у сям'і. Мы шмат часу надзяляем, напрыклад, інтэлектуальнаму развіццю дзіцяці: вучым пісаць, чытаць, замежным мовам, а вось як жыць разам, не вучым. Кансультуючы мужа і жонку, якія звярнуліся па псіхалагічную дапамогу, разумееш, што ў іх адсутнічае паняцце жаночай і мужчынскай псіхалогіі, у чым мы розныя і ў чым аднолькавыя. У школе можна было б увесці курс гендарнай культуры. А ў СМІ прапагандаваць агульначалавечыя каштоўнасці.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Прэзідэнт павіншаваў Віцебскую, Гомельскую, Мінскую і Магілёўскую вобласці з 75-годдзем

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў жыхароў Віцебскай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей з 75-годдзем з дня ўтварэння гэтых беларускіх рэгіёнаў.**

«Вы па праве можаце ганарыцца сваім старажытным і цудоўным краем, слаўнымі старонкамі яго гісторыі, сапраўды бясцэннымі помнікамі архітэктуры і мастацтва. На працягу доўгага часу і ў нашай краіне, і далёка за яе межамі ваш рэгіён вядомы як радзіма многіх знакамітых людзей, якія праславілі нашу Айчыну», — гаворыцца ў віншаванні жыхарам Віцебскай вобласці.

Звяртаючыся да жыхароў Гомельшчыны, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што вобласць адыгрывае важную ролю ў эканамічным развіцці Беларусі і пашырэнні гандлёвых сувязяў з замежнымі краінамі. «Галоўнае багацце вашага краю заўсёды складалі таленавітыя, працавітыя і моцныя духам людзі. Вы аднавілі народную гаспадарку пасля Вялікай Айчыннай вайны і пераадолелі наступствы глабальнай тэхнагеннай катастрофы — аварыі на Чарнобыльскай АЭС. З году ў год вы сваімі дасягненнямі павялічваеце дабрабыт рэспублікі і яе грамадзян», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Віншуючы жыхароў Мінскай вобласці, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэты рэгіён займае лідзіруючыя пазіцыі ў эканамічным і сацыяльна-культурным жыцці краіны. «Тут больш, чым у іншых рэгіёнах, будуецца жылля, вырабляецца збожжа, малака, мяса, тавараў і вырабаў, якія карыстаюцца шырокім попытам у Беларусі і за мяжой. Выпускаемыя ў вобласці самазвалы БелАЗ і прадукцыя «Беларуськалія» запатрабаваны на сусветным рынку. Дынамічнае развіццё рэальнага сектара эканомікі станоўча ўплывае на дабрабыт людзей», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да жыхароў Магілёўшчыны, адзначыў, што гэта вобласць сёння мае значны вытворчы, інтэлектуальны, інвестыцыйны патэнцыял і ўносіць істотны ўклад ва ўмацаванне айчыннай эканомікі, развіццё навукова-тэхнічнага прагрэсу, адукацыі і культуры. «Усё гэта стала вынікам працы некалькіх пакаленняў вашых землякоў. Менавіта яны, таленавітыя, адукаваныя, дзейныя і прадпрымальныя людзі, з'яўляюцца галоўным здабыткам вобласці», — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў суайчыннікам за ўклад у будаўніцтва моцнай і квітнеючай Беларусі і пажадаў шчасця, здароўя, дастатку, упэўненасці ў сваіх сілах і новых поспехаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## МІНШЧЫНА: БЫЦЬ ЗАЎСЁДЫ НАПЕРАДЗЕ!

**Святочныя ўрачыстасці ў гонар 75-годдзя Міншчыны ўчора ладзіліся ў Маладзечанскім Палацы культуры. Павіншаваць сталічную вобласць прыехалі высокія дзяржаўныя асобы, дзеячы навукі і мастацтва, прадстаўнікі дыпламатычных місій і духавенства.**



Фота БЕЛТА.

Міншчына — сэрца нашай краіны, як адзначалі на мерапрыемстве. Яе слаўная гісторыя пачыналася са старажытных Заслаўя, Старобіна, вёскі Студзёнкі пад Барысавам. Подзвігі больш позніх часоў увекавечаны ў Лініі Сталіна, Кургане Славы. Аднак на змену ваенным дасягненням прыйшлі і працоўныя.

Самая вялікая вобласць мае і самую буйную вытворчасць, што размяшчаецца ў Барысаве, Жодзіне, Салігорску ды іншых гарадах. Варта прыгадаць «Беларуськалій», на долю якога прыпадае кожная шостая тона солі ў свеце. Сваёй разгалінаванай вытворчасцю вядомы і БелАЗ, які набірае новую магутнасць для вытворчасці кар'ернай і дарожна-будаўнічай тэхнікі новага пакалення.

Першае месца Міншчына займае і па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі нашай краіны, якая, дарэчы, уваходзіць у пяцёрку самых малочных краін у свеце. Тут узгадваецца і гаспадарка «Сноў» — першы прыклад для аграгарадкоў краіны, і агракамбінат «Ждановічы», і інтэграваны агракамбінат «Дзяржынскі».

Мінскай вобласці належыць вядучае ў рэспубліцы месца па знешнеэканамічнай дзейнасці. З 2006 года знешнеэканамічны абарот таварамі вырас больш чым у два разы. Цяпер нашу прадукцыю ведаюць у 161 краіне свету.

Свае віншаванні працаўнікам Мінскай вобласці накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Святочнае пасланне са сцэны Палаца культуры ў Маладзечне зачытаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Тур. Кіраўнік дзяржавы адзначыў лідарскія паказчыкі Мінскай вобласці ў многіх галінах вытворчасці і адзначыў, што гэта стала магчыма дзякуючы самаахвярнай працы прадстаўнікоў самых розных прафесій і добрасумленнаму стаўленню да справы, уменню дабівацца пастаўленай мэты. Прэзідэнт пажадаў жыхарам Міншчыны шчасця, здароўя, упэўненасці ў сваіх сілах і новых поспехаў.

З урачыстым словам да прысутных звярнуўся і старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыс Батура:

— Які народ на зямлі здольны вынесці такі шматвекавы генацыд і пры гэтым не выраздзіцца, не счарсцвець сэрцам? Толькі той, што мае штосьці большае, чым усе багацці свету, — ні з чым не параўнаную моц духу, непагасную хрысціянскую веру, як бы яе ні знішчалі, і найвялікшую любоў да сваёй Бацькаўшчыны. З гэтага сплаву і створаны наш народ, а яго дзяржаўнасць, як ужо адзначалася, зараджалася тут, вакол старажытных гарадоў Міншчыны.

На свяце адбылося ўрачыстае ўручэнне званняў «Ганаровы грамадзянін Мінскай вобласці». Яго ўдастоіліся Уладзімір Дражын, пасол Беларусі ў Літве і Фінляндыі, народны артыст Беларусі Міхаіл Казінец, які зараз з'яўляецца кіраўніком і галоўным дырыжорам Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя Іосіфа Жыновіча. Таксама званне атрымаў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт.

Віншаванні прыйшлі і зусім здалёк — ад ураджэнца Мінскай вобласці, цяпер Прэзідэнта Ізраіля Шымона Перэса; пасланне свайго Прэзідэнта зачытваў пасол Ізраіля ў Беларусі Іосіф Шагал. Звяртаўся да прысутных і пасол Расійскай Федэрацыі Аляксандр Сурыкаў.

Цікавае віншаванне Мінскай вобласці прыйшло ад гульцоў футбольнага клуба БАТЭ, якія адзначылі, што іх поспехі і дасягненні на футбольным полі без падтрымкі вобласці былі б немагчымымі. БАТЭ падзякавала роднай Міншчыне за магчымасць у хуткім часе гуляць на суперсучасным стадыёне, роўных якому няма ў нашай краіне.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,**
*г. Маладзечна.*

### ■ Фінансавы тыдзень

## РУБЕЛЬ ТРЫМАЕ АБАРОНУ

А еўра звяртаецца па дапамогу да грэчаскай міфалогіі. Думаю, многія чулі ўжо пра тое, што новая купюра ў 5 еўра з'явіцца сёлета ў маі. У год Змяі еўра пачынае змяняць скуру. Сімвалічна. Але больш цікава тое, што на купюры будзе выява гераіні старажытнагрэчаскай міфалогіі — Еўропы, дачкі фінікійскага цара. Той самай Еўропы, якую выкраў Зеўс. Можа, Еўрапейскі цэнтрабанк вырашыў задобрыць гэтага міфічнага бога? Хутчэй за ўсё, гэта проста цікавыя супадзенні. Аднак некаторае ўзмацненне еўра апошнім часам назіраецца. І Беларусь гэта не абышло бокам. На мінулым тыдні беларускі рубель патаннеў увогуле ў дачыненні да ўсіх асноўных валют. Самы вялікі рост быў, вядома, у «еўрапейца» — 2,3%. Ачуняўшы, на гэтым тыдні беларуская нацыянальная валюта трымалася больш годна. Долар патаннеў на 50 рублёў (мінус 0,6%) да 8610. Еўра падаражэў на 40 рублёў (плюс 0,4%) да 11530. Расійскі рубель скінуў 1 рубель (мінус 0,4%) да 285.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

### ■ Надвор'е

## У НЯДЗЕЛЮ СУР'ЁЗНЫЯ СНЕГАПАДЫ, А ПОТЫМ І МОЦНЫЯ МАРАЗЫ

**Сёння на тэрыторыю нашай краіны завітае атмасферны фронт з боку Украіны, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў суботу месцамі невялікі снег, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра 11—16 марозу, на поўдні — мінус 5—10. У ноч на нядзелю на поўдні, а ўдзень ужо паўсюдна чакаюцца сур'ёзныя снегапады. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ў ноч на нядзелю мінус 10—17, па поўначы — да 20 марозу, удзень — мінус 7—14. Крыху цяплей будзе на поўдні: уначы — мінус 6—9, удзень — 4—6 градусаў ніжэй за нуль. У панядзелак снег будзе ісці толькі месцамі, а ў аўторак і сераду ападкаў амаль не будзе. Аднак маразы ўзмоцняцца. Прагназуецца, што ў першыя дні наступнага тыдня ўначы будзе ўжо мінус 12—19, а ў сераду і чацвер — да 20—23 марозу, удзень — мінус 7—13, месцамі да 15 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

## АСНОЎНЫЯ НАМАГАННІ БУДУЦЬ НАКІРАВАНЫ НА РОСТ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ ЛЮДЗЕЙ

**Дынамічнае развіццё Гомельскай вобласці і рост якасці жыцця людзей — прыярытэты, на вырашэнне гэтых задач будуць накіраваны асноўныя намаганні работы органаў мясцовага кіравання. Пра гэта заявіў учора старшыня аблвыканкама Уладзімір Дворнік на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 75-годдзю з дня заснавання Гомельскай вобласці, перадае БЕЛТА.**

Паводле слоў Уладзіміра Дворніка, шмат у чым гэта будзе вырашацца за кошт стабільнай працы прамысловага комплексу, які спрыяе канкурэнтаздольнасці рэгіёна на міжнароднай арэне і забяспечвае працай і заработнай платай тысячы людзей. «За 2012 год у разліку на аднаго жыхара ў вобласці выраблена прадукцыі амаль на Br86 млн. Гэта лепшы вынік у рэспубліцы. А ў снежні мінулага года сярэдняя заработная плата па вобласці дасягнула ўзроўню ў $500, або Br4,4 млн», — адзначыў губернатар.

Гомельшчына — экспартаарыентаваны рэгіён. Сёння больш як 60% усяго аб'ёму выраблenай прадукцыі гомельскіх прадпрыемстваў пастаўляецца на экспарт. Знешнегандлёвыя адносіны звязваюць вобласць больш чым са ста дзяржавамі. Асноўным партнёрам на працягу многіх гадоў застаецца Расійская Федэрацыя, на долю якой прыпадае больш як 50% знешняга гандлю. Для таго каб і далей развіваць гэтае супрацоўніцтва, пастаўленая задача ў 2013 годзе давесці аб'ём інвестыцый у асноўны капітал да $3 млрд.

Паўднёвы ўсход Беларусі ва ўсе часы лічыўся ў маштабах рэспублікі самабытным краем, які валодае непаўторным прыродным каларытам і багатай культурнай спадчынай. «Гомельшчына з'яўляецца паспяховым рэгіёнам. 75 гадоў мы, нашы бацькі і дзяды будавалі гэты дабрабыт. З кожным годам мы імкнёмся прымнажаць яго. Эканамічны патэнцыял, паспяховыя знешнеэканамічныя сувязі і наша любоў да роднага краю будуць спрыяць развіццю вобласці. У нас агульная адказнасць за будучыню Гомельшчыны. І наш абавязак — унесці свой уклад у працвітанне малой радзімы», — падкрэсліў Уладзімір Дворнік.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне ў сувязі з 75-годдзем Гомельскай вобласці. Падчас урачыстага сходу яго зачытаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый Міцкевіч. У віншаванні гаворыцца, што за гэты перыяд вобласць паспяхова прайшла шлях станаўлення і развіцця, упісала нямала запамінальных старонак у гісторыю дзяржавы.

**БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

**Першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка ўручае грамату Савета Міністраў гендырэктару ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» Анатолю Купрыянаву.**

### ■ Гандбол

## НЕ ДАТРЫВАЛІ...

**Зборная Беларусі па гандболе правяла на сёлетнім чэмпіянаце свету, напэўна, лепшы свой матч, аднак вынік сустрэчы са Славеніяй усё роўна адмоўны.**

Лёс з балканцамі звёў нас не толькі ў групавой стадыі планетарнага першынства ў Іспаніі, але і ў адборачным турніры чэмпіянату Еўропы. І наўрад ці нехта з балельшчыкаў забыўся пра лістападаўскую «сечу» гэтых зборных у Мінску, калі на апошніх секундах трапны кідок Дзяніса Рутэнкі заканстатаваў у пратаколе нічыю — 32:32.

Матч у Сарагосе таксама атрымаўся захапляльным. Добрую палову гульні падапечныя Юрыя Шаўцова вялі ў ліку, апярэджваючы вядомага апанента! Зноў добра дзейнічаў Сяргей Рутэнка, важныя мячы закідвалі Дзмітрый Нікуленкаў і Аляксандр Цітоў. І гэта сапраўды была каманда, якая «згінала» аднаго з лідараў групы «С». Перавага ў пяць галоў сведчыць пра многае. Шкада, але пасля перапынку перавага беларусаў ператварылася ў нішто. Вопыт перамог азарт, упэўненасць — памылкі. Лік да апошніх хвілін быў роўным, але хлопцы Барыса Дэніча ўсё ж такі вырвалі перамогу — 27:26. «На жаль, мы не ўзялі двух балаў, якія цалкам заслугоўвалі», — падводзіў пасля сустрэчы вынікі Юрый Шаўцоў. Зразумела, яны шкадуюць: не датрывалі. Аднак у пэўны моманты хлопцы прадэманстравалі гульню, пра якую мараць заўзятары. Спадзяёмся, не ў апошні раз. Заключны паядынак групавога турніру Беларусь правядзе сёння супраць Саудаўскай Аравіі. Гэтая сустрэча і выявіць таго, хто зойме ў групе патрэбнае чацвёртае месца.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

### ■ Меркаванне

# БЕЛАРУСЬ І КІТАЙ НА ШЛЯХУ «ІНТЭГРАЦЫІ ІНТЭГРАЦЫЙ»

**Як адзначыў беларускі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас сваёй прэс-канферэнцыі айчынным і замежным СМІ, гэта стагоддзе будзе праходзіць пад знакам росту сілы Кітая. І таму цалкам апраўдана, што Беларусь працягне курс на развіццё цесных адносін з гэтай краінай, нягледзячы на незадаволенасць Еўрасаюза і некаторыя супярэчнасці з Расіяй на гэты конт.**

Але выбудоўваючы стратэгічнае партнёрства з Паднябеснай, беларускаму боку трэба ўлічваць, з аднаго боку, абавязацельства ў рамках еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў і, з іншага боку, кітайскі погляд на працэсы еўразійскай інтэграцыі.

Еўразійскія інтэграцыйныя працэсы прыцягваюць пільную ўвагу з боку кітайскай экспертнай супольнасці, пацвярджэнне чаго мы можам знайсці ў шэрагу публікацый вядучых кітайскіх «фабрык думкі» — Кітайскай акадэміі сучасных міжнародных адносін, Кітайскага цэнтра па даследаванні сучаснага свету пры Міністэрстве абароны ЦК КПК і падобных ім. І такая пільная ўвага кітайскага боку зразумела: найбольш працяглую мяжу Кітай мае з краінамі постсавецкай прасторы, і з улікам новай геапалітычнай рэальнасці Кітаю трэба ўносіць карэктывы ў сваю знешнюю палітыку, асабліва ў дачыненні да краін Цэнтральнай Азіі, на якія ў перспектыве можа распаўсюдзіцца праект Еўразійскага саюза (Казахстан ужо з'яўляецца ўдзельнікам гэтых інтэграцыйных працэсаў, Кыргызстан і Таджыкістан заявілі аб гатоўнасці далучыцца да іх у бліжэйшы час).

У сваіх ацэнках еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў кітайская экспертная супольнасць салідарна з тым, што Еўразійскі саюз — гэта праект, ініцыяваны Крамлём дзеля ўзмацнення сваёй палітычнай, эканамічнай і ваеннастратэгічнай прысутнасці Расіі ў краінах постсавецкай прасторы. І безумоўна, гэтыя інтэграцыйныя працэсы будуць уплываць як на кітайска-расійскія двухбаковыя адносіны, так і на адносіны Кітая з з любой іншай краінай постсавецкай прасторы.

Далей ацэнкі кітайскіх экспертаў разыходзяцца. Яны могуць быць рэзюміраваны да некалькіх пазіцый. У адпаведнасці з першай, не самай шматлікай у кітайскім экспертным асяроддзі, еўразійскія інтэграцыйныя працэсы не могуць несці істотнай пагрозы кітайскім інтарэсам, перш за ўсё маюцца на ўвазе інтарэсы ў Цэнтральнай Азіі. На думку кітайскіх экспертаў, Кітай са сваім пакетам інвестыцый і інфраструктурных праектаў у Цэнтральнай Азіі мае больш пераваг, чым Расія, нават нягледзячы на тое, што яна запрашае далучыцца краіны Цэнтральнай Азіі да Еўразійскага эканамічнага саюза ў будучыні. Таму Кітаю не трэба баяцца страты сваёй сілы ў Цэнтральнай Азіі, бо, акрамя ўніфікацыі эканамічных умоў, Расія не можа прапанаваць сваім цэнтральнаазіяцкім партнёрам прымальнага фармату, у адрозненне ад Кітая з яго пакетам інвестыцый і інфраструктурных праектаў. Таму Еўразійскі саюз не нясе пагроз кітайскім інтарэсам наогул.

Іншая пазіцыя кітайскіх экспертаў заключаецца ў тым, што еўразійскія інтэграцыйныя працэсы накіраваны на стварэнне сістэмных бар'ераў для нарошчвання кітайскай палітычнай і эканамічнай прысутнасці ў краінах постсавецкай прасторы — перш за ўсё, Цэнтральнай Азіі. Нават выказваюцца меркаванні, што сама еўразійская інтэграцыя ў выглядзе будучага Еўразійскага эканамічнага саюза была ініцыявана ў процівагу кітайскай прысутнасці ў Цэнтральнай Азіі і не толькі, бо Кітай зараз актыўна пранікае ў іншыя краіны постсавецкай прасторы, і Беларусь таму прыклад. Кітай актыўна выдае крэдытныя лініі Украіне, некаторым краінам Цэнтральнай Еўропы.

**Кітайскія эксперты апасаюцца, што па меры інтэнсіфікацыі еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва можа страціць сваю эфектыўнасць.**

Трэцяя пазіцыя можа быць ахарактарызавана як відавочная канкурэнцыя паміж Кітаем і Расіяй за ўплыў на постсавецкай прасторы. Апошні саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва па дыялогу (ШАС) таму сведчанне. Падчас яго былі заблакіраваны ўсе цэнтральнаазіяцкія ініцыятывы Кітая — перш за ўсё праект Банка развіцця ШАС, ідэя спецыяльнага рахунку для краін ШАС і праект стварэння зоны свабоднага гандлю ШАС.

Кітайскія эксперты апасаюцца, што па меры інтэнсіфікацыі еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў ШАС як інструмент рэгіянальнага супрацоўніцтва па пытаннях бяспекі і эканомікі можа страціць сваю эфектыўнасць і прыйдзе ў заняпад.

Самую галоўную заклапочанасць кітайскіх экспертаў выклікае той факт, што праект Еўразійскага саюза, як ён падаецца ў праграмным артыкуле прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, арыентаваны на ўбудаванне ў еўраатлантычныя палітычныя, эканамічныя і ваенныя інстытуты. У гэтым кантэксце — з'яўленне натаўскай базы пад Ульянаўскам, непроцідзеянне расійскага боку нарошчванню ваеннай прысутнасці НАТА ў краінах Цэнтральнай Азіі (да 2014 года ў шэрагу цэнтральнаазіяцкіх краін павінна быць разгорнута сетка баз захоўвання ваеннай тэхнікі, якая будзе выводзіцца з Афганістана). Безумоўна, гэтыя факты не могуць не выклікаць занепакоенасць кітайскага боку.

У той жа час Беларусь прапаноўвае іншы погляд на еўразійскую інтэграцыю, чым Расія. Для Беларусі, еўразійская інтэграцыя мае фармат «інтэграцыі інтэграцый», які прадугледжвае вельмі шырокі фармат неканкурэнтнага супрацоўніцтва ў Еўразіі, накіраваны на стварэнне не толькі агульнага рынку, але і рэалізацыю транс'еўразійскіх інфраструктурных праектаў. У гэтым кантэксце Кітайска-беларускі індустрыяльны парк і ёсць увасабленне ідэі «інтэграцыі інтэграцый». Але беларускаму боку не трэба расслабляцца, бо Кітай зараз актыўна пранікае ў краіны Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, выдзяляе для іх крэдытныя лініі. І каб Беларусі не канкурыраваць з гэтымі краінамі за стратэгічную ўвагу з боку Кітая, ёй варта было б паспрабаваць пераўтварыцца ў «аператара» кітайскіх інвестыцый у рэгіён у цэлым і распрацаваць сумесна з нашымі краінамі-суседзямі спецыяльны план, з улікам таго, што першы буйны праект Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку ажыццяўляецца на беларускай тэрыторыі.

У сакавіку 2013 года па выніках сесіі Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Сі Цзіньпін зойме вышэйшую дзяржаўную пасаду — старшыні КНР. І гэта значыць, што адразу можна будзе чакаць узаемнага абмену візітамі вышэйшага кіраўніцтва Кітая і Беларусі. Па яго выніках можна будзе меркаваць аб тым, наколькі сапраўды беларуска-кітайскія адносіны дасягнулі стратэгічнага вымярэння.

**Арсеній СІВІЦКІ**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## РЭЧАВЫЯ РЫНКІ ВАБЯЦЬ НІЗКІМІ ЦЭНАМІ

**Жыхары Магілёўскай вобласці не гатовы да закрыцця рэчавых рынкаў.**

З ініцыятывы ўпраўлення гандлю Магілёўскага аблвыканкама прайшло грамадскае абмеркаванне наконт упарадкавання дзейнасці рынкаў. У апытанні бралі ўдзел 2500 чалавек, і больш за 2 тысячы з іх выказаліся супраць закрыцця рэчавых рынкаў. Хоць яны і знаходзяцца пад адкрытым небам і да цалкам цывілізаванага гандлю іх цяжка аднесці, але людзі адзначылі больш нізкія, у параўнанні з сучаснымі гандлёвымі цэнтрамі, цэны на тавары. Калі выпадае эканоміць, прымальныя кошты кампенсуюць нязручнасці.

Між тым, удзельнікі апытання выказалі пажаданні: напрыклад, аб стварэнні прымерачных пакояў. Для пакупнікоў і прадаўцоў на рынках патрэбны нармальныя выгоды. Таксама знайшла падтрымку ідэя аб стварэнні спецыялізаваных рынкаў для продажу «сэканд-хэнду» і рамесніцкіх вырабаў. Спецыялісты абласнога ўпраўлення гандлю падкрэслілі, што паляпшэнне інфраструктуры рынкаў (а іх у Магілёўскай вобласці каля 60) будзе сёлета перспектыўным кірункам дзейнасці.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ЗІМОВЫ БУКЕТ

**У Цэнтры культуры «Віцебск» можна будзе ўбачыць, як ні дзіўна, зімовы букет. І не адзін. Выстава з аднайменнай назвай — рэалізаваныя фантазіі старэйшага на Віцебшчыне, а можа, і на ўсёй Беларусі народнага клуба кветкаводаў-аматараў. Гэты клуб летась адзначыў 25-гадовы юбілей.**

На выставе ў цэнтры прадстаўлены новыя «кветкавыя» працы. У прыватнасці, кампазіцыі з сухіх кветак і прыродных матэрыялаў, творы фларыстыкі і многае іншае. Кожны ўдзельнік сваёй працай прадэманструе не толькі творчыя здольнасці ў пераўтварэнні прыроднага матэрыялу ў суцэльную мастацкую кампазіцыю, але і ўласнае бачанне кветкавага свету. Усе наведнікі змогуць задаць пытанні арганізатарам экспазіцыі: у віцебскіх кветкаводаў багаты вопыт і тэарэтычная падрыхтоўка ў справах раслінных.

На жаль, толькі на адзін дзень — 21 студзеня — расквітнее «Зімовы букет».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ВЫРАТАВАЛЬНІКІ «АСВОЯЦЬ» ХМАРАЧОСЫ

**У сувязі з актыўным будаўніцтвам у сталіцы высотных будынкаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях плануе папоўніць свой арсенал абсталяваннем, якое можа спатрэбіцца для працы на такіх аб'ектах.**

Пра гэта паведаміў журналістам падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка.

— Мы намагаемся пастаянна ўдасканальваць тэхніку, якую выкарыстоўваюць нашы супрацоўнікі пры ліквідацыі надзвычайных сітуацый. Што датычыцца высотных будынкаў, то тут пытанні бяспекі прадумваюцца, пачынаючы са стадыі праектавання і будаўніцтва. Зараз мы набываем тэхніку, на якой можна будзе працаваць пры выратаванні людзей на паверхах дамоў, а таксама абмяркоўваем пытанне па набыцці верталёта, які мае функцыю гарызантальнага тушэння пажару. У бюджэце горада Мінска неабходныя сродкі запланаваны. Арыенціровачны кошт новай машыны, якая, верагодна, хутка з'явіцца ў арсенале беларускіх выратавальнікаў, складае 120 мільярдаў рублёў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## ЗАМЕЖНІКІ ДОБРА ПЛАЦЯЦЬ ЗА ПАЛЯВАННЕ

**Колькасць паляўнічых тураў з удзелам замежных грамадзян павялічылася летась у Магілёўскай вобласці амаль удвая. Сотня такіх тураў прынесла даход лясной гаспадарцы ў 1,6 мільярда рублёў.**

У асноўным у Беларусь на паляванне прыязджаюць расіяне, а таксама ўкраінцы і немцы. Яны палююць на дзікоў, ласёў і аленяў. Замежнікі складаюць меней за 10% ад агульнай колькасці паляўнічых у рэгіёне, але на іх долю прыпадае каля паловы атрыманых прыбыткаў. Паляўнічы турызм — выгадная справа і перспектыўны кірунак працы. Таму ў 12-ці з 13-ці лягсасаў Магілёўшчыны створаны свае паляўнічыя гаспадаркі, і яшчэ адна будзе арганізавана ў Краснапольскім раёне.

**Алена КАЗЛОВА.**

## У ТУРЦЫЮ — СА СВАБОДНЫМІ СТАРОНКАМІ Ў ПАШПАРЦЕ

**З пачатку года змяніліся патрабаванні Турэцкай Рэспублікі да пашпартоў грамадзян Рэспублікі Беларусь.**

Да канца мінулага года замежным грамадзянам, якія не мелі дастатковай колькасці свабодных старонак у пашпарце, выдавалася «Турэцкая ўязная-выязная форма для іншаземцаў, якія не маюць свабоднага месца ў сваіх пашпартах ці дакументах, якія іх замяняюць». Яна ўяўляла сабой спецыяльны ўкладыш на дзвюх старонках. Гэты ўкладыш неабходна было мець пры сабе падчас знаходжання ў Турцыі і прад'яўляць пры выездзе з краіны.

Пасольства Турэцкай Рэспублікі ў нашай краіне прадаставіла інфармацыю, якая датычыцца некаторых пытанняў парадку ўезду ў Турцыю. Так, Законам аб пашпартах гэтай краіны прадугледжана наяўнасць у іншаземнага грамадзяніна пры ўездзе або выездзе з Турцыі сапраўднага пашпарта (ці дакумента, які замяняе яго) з дастатковай колькасцю свабодных старонак для прастаўлення візавых штампаў/наклейкі марак і прастаўлення штампаў аб уездзе/выездзе.

У гэтай сувязі Міністэрства ўнутраных спраў інфармуе, што замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія не маюць дастатковай колькасці свабодных старонак у пашпарце, будзе адмоўлена ва ўездзе на тэрыторыю Турцыі. Калі хто з суайчыннікаў збіраецца наведаць гэтую краіну, неабходна загадзя паклапаціцца пра замену пашпарта.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## РАСПАЛІЛІ ВОГНІШЧА НА СНАРАДЗЕ...

**У гісторыі пра тое, як ваенныя пацярпелі падчас вучэнняў на палігоне пад Віцебскам, пастаўлена кропка.**

Нагадаем, што там восенню мінулага года ў выніку выбуху пацярпелі два афіцэры-дэсантнікі. Аднаму з іх давялося ампутаваць частку нагі. Другога хутка выпісалі з лячэбнай установы.

Паводле слоў Уладзіміра Шалухіна, начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Віцебскай вобласці, падчас расследавання высветлілася, што тады адбыўся няшчасны выпадак. Падчас праверкі вінаватасць кагосьці не ўстаноўлена. Пасля інцыдэнту адразу канфіскавалі рэшткі выбуховага ўстройства — гэта, хутчэй за ўсё, рэшткі артылерыйскага снарада часоў Вялікай Айчыннай вайны. Вогнішча распалілі на тым месцы, дзе пад зямлёй знаходзіўся снарад. У выніку і адбыўся выбух. Парушэнняў з боку ваеннаслужачых пры правядзенні вучэнняў, арганізацыі стаянкі не ўстаноўлена. Таму па гэтым факце было прынята рашэнне аб адмаўленні ў завядзенні крымінальнай справы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## СУТЫКНУЎСЯ З АГАРОДЖАЙ КАПЛІЦЫ

**У Баранавіцкім раёне аўтамабіль урэзаўся ў агароджу капліцы на месцы бітвы 1863 года. Работнікі МНС выратавалі пасажыра.**

Такое дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ўдзень паблізу вёскі Калпакі. Вадзіцель аўтамабіля «Фольксваген-Шаран» не справіўся з кіраваннем, у выніку чаго аўто з'ехала ў кювет і сутыкнулася з жалезабетоннай агароджай капліцы на месцы бітвы 1863 года. Кіроўца не пацярпеў. Пасажырка самастойна выбралася з салона, а мужчына на пярэднім сядзенні аказаўся заблакіраваным у салоне. Яго давялося даставаць пры дапамозе аварыйна-выратавальнага інструменту. І кіроўцу, і пасажырку даставілі ў бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Як жывяце, землякі?

У РЭГІЁНЕ

Брэстчына

## ПЕРШАЯ ЛАСТАЎКА АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ

**У Брэсце нарэшце здадзены ў эксплуатацыю першы арэндны дом**

10-павярховы панэльны дом у мікрараёне «Вулька-3» мае 40 аднапакаёвых і 40 двухпакаёвых кватэр. Паводле інфармацыі гарвыканкама, плата за жыллё прывязаная да базавай велічыні. Зараз яна складае за аднапакаёвую кватэру 625-636 тысяч рублёў у залежнасці ад плошчы, за двухпакаёвую — 937-948 тысяч рублёў. На наступным тыдні ў гарвыканкаме пачнуць прымаць заявы на арэнду жылля. Прыярытэт у тых, хто стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў.

**Яна СВЕТАВА.**

## ФАЛЬКЛОР БЕЗ МЕЖАЎ

**Фестываль «Фальклор без межаў» пройдзе ў Іванаўскім раёне на Вадохрышча — 19 студзеня**

Гэта ўжо восьмы міжнародны фэст народнай песні, танца і гумару. Гэтым разам чакаюць гасцей з Польшчы, Украіны і Расіі. На свята збіраюцца лепшыя самадзейныя калектывы Брэстчыны і, вядома, Іванаўскага раёна. Як і ў мінулыя гады, фестываль адкрыецца выступленнем царкоўных хароў. Мерапрыемства пачнецца ў Іванаўскім Цэнтры культуры і народных традыцый, а працягнецца ў вёсцы Тышкавічы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Віцебшчына

## ЗІМА КЛІЧА!

**19-20 студзеня ў Віцебску гараджане і госці горада змогуць узяць удзел у шматлікіх культурна-масавых, спартыўных і забаўляльных мерапрыемствах, прысвечаных прыгажуні-зіме**

У гэтыя дні на плошчы Перамогі гасцей свята чакаюць сустрэчы з самадзейнымі мастацкімі калектывамі і дыскатэка, культурна-спартыўнае свята, а таксама конкурс ледзяных фігур. На віцебскім «арбаце» — пешаходнай вуліцы Суворава — пройдзе выстава-кірмаш работ народных майстроў, мастакоў, навучэнцаў мастацкіх школ. У комплексе культурна-масавага адпачынку імя Савецкай Арміі праводзяцца Дні масавага адпачынку гараджан «У выхадныя — усёй сям'ёй!» і «Зіма запрашае на старт!». 20 студзеня аматараў спорту і актыўнага ладу жыцця запрасілі на культурна-спартыўнае свята, прысвечанае Сусветнаму дню снегу, якое пройдзе ў пойме ракі Віцьба. Будуць працаваць пункты пракату спартыўнага інвентару і аб'екты гандлю.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Гомельшчына

## ТРЫ ЧВЭРЦІ СІРОТ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ ЖЫВУЦЬ У СЕМ'ЯХ

**У Мазыры адкрыўся дзіцячы дом сямейнага тыпу**



Фота БЕЛТА.

Яго ўвод, як і папярэдняга, у Добрушы, прымеркаваны да 75-годдзя Гомельскай вобласці. Будаўніцтва гэтага аб'екта вялося на працягу года. Усяго было выдаткавана Br2,3 млрд з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў. Абсталяваць прыгожай мэбляй і неабходнай бытавой тэхнікай дапамаглі прадпрыемствы Мазырскага раёна, якія аказалі значную матэрыяльную дапамогу. Жыць у гэтым доме будзе вялізная сям'я Васіля і Ірыны Дзенісенкаў, якія выхоўваюць траіх сваіх непаўналетніх дзяцей і пяцярых сацыяльных сірот. Васіль Аляксандравіч працуе на Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе, Ірына Сяргееўна — прыёмнай маці ў аддзеле адукацыі райвыканкама.

Дарэчы, зараз у Гомельскай вобласці існуе 29 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, у якіх пражывае 243 дзіцяці. Увогуле ж 77% дзяцей-сірот і дзяцей, пакінутых без апекі бацькоў, у рэгіёне выхоўваюцца ў сямейных калектывах. Маюцца на ўвазе не толькі дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, але і прыёмныя, апякунскія сем'і.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Гродзеншчына

## НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ СУЧАСНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Напачатку гэтага года спіс рэзідэнтаў свабоднай эканамічнай зоны «Гроднаінвест» папоўніўся трыма новымі прадпрыемствамі**

Адкрытае акцыянернае таварыства «Гроднагандальмаш» плануе інвестыцыйны праект па вытворчасці розных відаў абсталявання для прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання. Навагрудскі завод газавай апаратуры ставіць мэту нарошчвання аб'ёмаў выпуску бытавых газавых балонаў па еўрапейскіх стандартах, асваенне вытворчасці дамавых рэгулятараў газу, укараненне рэсурсазберагальных тэхналогій.

А Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка разлічвае скарыстацца спецыяльным прававым рэжымам СЭЗ дзеля закупкі сучаснага абсталявання і вытворчасці паўкамвольнай і фасоннай пражы, якая адпавядае еўрапейскім патрабаванням якасці.

## СЛУЖБОВЫ САБАКА «ЗАТРЫМАЎ» НАРКАКУР'ЕРА

**Сабака, які служыць у пункце пропуску «Каменны Лог», заслужыў «прэміяльны» абед: дзякуючы яму ў Беларусь не трапіла буйная партыя какаіну**

Службовы сабака ўчуў наркотыкі ўначы пры афармленні «Фольксвагена», у якім накіроўваўся ў нашу краіну 33-гадовы літовец, жыхар Каўнаскага раёна. І сапраўды, у прыборнай панэлі аўтамабіля выявілі скрутак з рэчывам шэрага колеру. Экспертызай устаноўлена, што гэта какаін — буйная партыя вагой 203,5 грама.

У дачыненні наркакур'ера заведзены крымінальныя справы па фактах кантрабанды і незаконнага абарачэння наркатычных, псіхатропных рэчываў і прэкурсораў. За гэтыя правапарушэнні яму пагражае да 13 гадоў пазбаўлення волі, паведамляе прэс-цэнтр Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Магілёўшчына

## БОЛЬШ ПРАЦЫ ДЛЯ БУСЛОЎ

**У Магілёўскай вобласці павялічылася нараджальнасць. Больш за 12,5 тыс. дзяцей нарадзілася ў рэгіёне летась**

Каштоўная прыбаўка да папярэдняга года склала 554 дзіцяці.

Нараджальнасць павялічылася найперш у гарадах, але таксама і ў сельскіх раёнах на свет з'явілася болей дзяцей.

— Гэта ў асноўным вынік сацыяльнага стымулявання, — пракаментавала **Таццяна КАНЯЕВА, якая выконвае абавязкі галоўнага педыятра упраўлення аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама.** — Нараджальнасць павялічваецца цяпер якраз за кошт другога і трэцяга дзіцяці.

Між тым, дзіцячая смяротнасць і захваральнасць памяншаюцца, таму нездарма агульнае паляпшэнне паказчыкаў тлумачыцца таксама павышэннем якасці медыцынскага абслугоўвання і актыўнай санітарна-асветніцкай працы.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ГУЛЯЙ, ГРАМАДА! БЫВАЙ, КАЛЯДА!





*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Іванавай Слабадзе, калі гурт шчадроўнікаў выпраўляецца па вёсцы, жыхары выходзяць на вуліцу, вітаюць гэтае вясёлае шэсце і чакаюць, а часам і просяць, каб каза іх баднула. Добрая прыкмета — калі каза рогам у бок. Тут спрадвеку спяваюць:

*«Го-го-го, каза, го-го-го, серая,*
*Дзе ты хадзіла, дзе ты брадзіла?*
*Шчодры вечар, дзе ты хадзіла?...»*

А ў Тонежы калядоўшчыкаў чакаюць у хатах, прыслухоўваюцца, калі тыя пастукаюць у акенца. Тонежскі гурт, ідучы вуліцай, спявае:

*«На белым кані едзе Каляда,*
*Яе конічак — ясны месячык,*
*Яе дужачка — ясна зорачка,*
*Яе пужачка — ясна звёздачка...»*

Слабодскія калядоўшчыкі, заходзячы ў двор, стукаюць у акно і пытаюцца:

*«Ці дома-дома сам пан-гаспадар?*
*Шчодры вечар, сам пан-гаспадар?..»*

Калі на ганку дома з'яўляецца гаспадар, калядныя валачобнікі пасыпаюць яго збожжам, кажучы: «Сею-пасяваю, шчасця і здароўя вам жадаю!»

«Добры вечар! Загадайце на Шчодры вечар!», — голасна крычыць гурт.

Вядома, хто адмовіць вестунам пра Божае Нараджэнне!

— Спявайце! — кажа тонежскі гаспадар і слухае, ці зладжана гучыць:

*«Ходзіць-паходзіць месяц па небу,*
*Клічэ-паклічэ зорку з сабою...» .*

У Слабадзе пад спевы гурта ў скокі кідаецца каза:

*«Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць,*
*Дзе каза нагой, там жыта капой,*
*Дзе каза рогам, там жыта стогам...»*

У Іванавай Слабадзе не прынята запрашаць шчадроўнікаў у хату, пачастунак выносяць на двор. У Тонежы — наадварот, жадаюць, каб козачка патанчыла ў доме, пасядзела за сталом. Задаволеныя шчодрым прыёмам тонежскія каляднікі прысвячаюць песні-зычэнні і гаспадарам, і іх дзецям.

Сёлета ў Слабадзе нават вадзілі жывую казу. А вось традыцыйную «казу-ляпу» на палцы не падрыхтавалі. У Тонежы галава казы выглядала сапраўдным прышэльцам з сівой-сівой мінуўшчыны. Гэта пра яе, казу на палцы, і ў Тонежы, і ў Слабадзе, кажуць:

*«Каза ходзіць — нячысцікаў выводзіць,*
*Каза ходзіць — шчасце водзіць».*

Традыцыя калядавання ў Тонежы і Іванавай Слабадзе захоўваецца дзякуючы ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці, вясковым фальклорным гуртам і асабіста кіраўнікам сельскіх дамоў культуры Вользе Карась і Тамары Прыбылавец. Усе яны зберагаюць і, па-сутнасці, з'яўляюцца апошнімі носьбітамі ўнікальных народных традыцый. Таму, няхай добразычлівая каза-калядоўшчыца спрыяе захаванню гэтага духоўнага скарбу Палесся для нашых нашчадкаў!

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Лельчыцкі раён.*







■ Асабісты інтарэс

# УВАГА: ТЭЛЕФОННЫЯ АШУКАНЦЫ!

## Мабільны аператар «МТС» склаў спіс самых распаўсюджаных спосабаў «разводу на грошы»



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Выпадкі махлярства з выкарыстаннем паслуг сувязі ў наш час не рэдкасць. Больш за тое, з развіццём тэхналогій з'яўляюцца новыя схемы адабрання грошай у карыстальнікаў сотавай сувязі. SMS-рассылкі з просьбай дапамагчы сабраць грошы, вірусныя напады, спасылкі на агульных знаёмых у сацыяльных сетках — вось далёка не поўны пералік спосабаў атрымаць доступ да асабліва канфідэнцыйнай інфармацыі. Па сутнасці, ахвярай гэтых схем можа стаць любы ўладальнік мабільнага тэлефона, ад малога да вялікага — гэта значыць, кожны з нас...**

«Спецыялісты кампаніі МТС пастаянна працуюць над выяўленнем і аналізам крыніц, з якіх робяцца рассылкі падманных паведамленняў. Аднак ашуканцы часта прыдумляюць новыя, больш мудрагелістыя схемы, — тлумачыць **першы намеснік генеральнага дырэктара СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» Яўген БРАНЦАЎ.** — Нярэдка складаюцца сітуацыі, калі абаненту патрабуецца дапамога, і ён звяртаецца па яе ў МТС. Прадстаўнікі кампаніі неадкладна адгукаюцца на яго зварот. Калі выяўляецца парушэнне правоў абанента, кампанія МТС разам з ім звяртаецца ў праваахоўныя органы, кампетэнтныя ў такога роду пытаннях. У далейшым аператар суправаджае абанента да моманту поўнага вырашэння праблем, якія ўзніклі».

Каб дапамога кампетэнтных органаў усё ж такі не спатрэбілася, спецыялісты кампаніі раяць абанентам і самім не губляць пільнасць. Не адпраўляйце SMS і не тэлефануйце на невядомыя нумары, уважліва вывучыце дэталі атрыманых паведамленняў, перапраўярайце звесткі, не раскрывайце асабістую інфармацыю (у тым ліку сакрэтныя коды і паролі) незнаёмцам, кім бы яны не называліся, і не перадавайце трэцім асобам свае SIM-карткі ці 3G-мадэмы.

## ПРАЦА ПА СХЕМЕ: УЛЮБЁНЫЯ МЕТАДЫ АШУКАНЦАЎ

Па якіх прыкметах можна меркаваць, што гаворка ідзе пра махлярства, а таксама што трэба і чаго не трэба рабіць, сутыкнуўшыся з ім? Па гэтых пытаннях спецыялісты МТС склалі своеасаблівую памятку для абанентаў.

### Вы выйгралі!

Абаненту прыходзіць SMS з невядомага нумара або з інтэрнэту, паведамляючы аб выйгрышы каштоўнага прыза. Каб яго атрымаць, трэба пералічыць пэўную суму на нейкі рахунак. Як правіла, адпраўнікі абгрунтоўваюць гэта неабходнасцю пакрыць накладныя выдаткі, якія вось-вось акупяцца.

### Ратуйце дзіця

Абанент атрымлівае паведамленне з невядомага замежнага нумара пра неабходнасць знайсці кроў рэдкай групы для выратавання дзіцяці. У паведамленні паказваецца нумар тэлефона, званкі на які аўтаматычна спусташаюць рахунак таго, хто на яго патэлефануе. Незнаёмы нумар павінен насцярожыць абанента і прымусіць яшчэ раз задумацца, куды трапяць яго сродкі.

### Ваш камп'ютар заблакіраваны

Ашуканцы выкарыстоўваюць вірусанае праграмнае забеспячэнне, якое блакіруе экран камп'ютара. Для разблакіроўкі прапануецца даслаць SMS (за адпраўку якога, зразумела, спісваюцца грошы) на кароткі нумар. Пасля чаго дасылаецца код, які можна ўвесці ў спецыяльнае поле на экране камп'ютара і аднавіць яго працу. Не стаць ахвярай падобнай схемы даволі проста: усталяваць добрую антывірусную абарону на камп'ютары і рэгулярна абнаўляць яе.

### Запазычанасць па крэдыце

Абаненту прыходзіць SMS: «Банк X адмовіў вам у выдачы крэдыту». Праз некалькі дзён раздаецца званок з незнаёмага нумара. Аўтаадказчык, прадставіўшыся банкам X, кажа: «Нагадваем вам аб неабходнасці пагасіць крэдыт. Калі хочаце праслухаць паведамленне яшчэ раз, націсніце 1, для злучэння з аператарам націсніце 2». Натуральна, абанент выходзіць на аператара, які праўдападобна апісвае сітуацыю з запазычанасцю па крэдыце. Для больш дэталёвага высвятлення абставін псеўдааператар прапануе злучыць абанента са службай бяспекі банка, задачай якой на самой справе з'яўляецца выманьванне асабістай інфармацыі, нумароў крэдытных картак і гэтак далей. Нядзіўна, што пасля гэтага з карт-рахункаў пачынаюць знікаць грошы.

Ні ў якім разе не раскрывайце нікому свае асабістыя звесткі! Папрасіце «прадстаўнікоў банка» даць як мага больш інфармацыі аб банку: тэлефон, адрас, кантактная асоба. Абавязкова праверце інфармацыю ў адкрытых крыніцах.

### Бонусы ў сацыяльных сетках

Абаненту прыходзіць паведамленне ў сацыяльнай сетцы, дзе ёсць пералік платных сэрвісаў, ад незнаёмага чалавека, зарэгістраванага пад імем каго-небудзь з сяброў абанента. Тэкст прыкладна наступны: «Прывітанне, я завёў новую старонку, цяпер пішы мне сюды. І нагадай нумар свайго тэлефона — я прышлю табе сюрпрыз». Атрыманы нумар мабільнага зламыснік рэгіструе як уласны ў платным сэрвісе сацыяльнай сеткі і просіць абанента паведаміць праверачны код, які прыходзіць яму па SMS. Перадаўшы гэты код трэцяй асобе, абанент рызыкуе пазбавіцца часткі сродкаў асабовага рахунку.

### У стане афекту

SMS і званкі, якія шакіруюць атрымальніка — часцей за ўсё ў іх паведамляецца, што блізкія або сябры абанента патрапілі ў бяду. Напрыклад, ахвяры такога махлярства тэлефануе невядомы, і, назваўшыся супрацоўнікам праваахоўных органаў, паведамляе, што блізкі сваяк суразмоўцы ў нецвярозым стане здзейсніў наезд на пешахода. Сітуацыю прапануецца ўладзіць за буйную суму, якую трэба пералічыць на пэўны асабовы рахунак. Нярэдкія выпадкі, калі людзі, знаходзячыся ў стане шоку і глыбокага спалоху, слепа вераць ашуканцам.

### SMS-шпіён

Ашуканцы рэкламуюць «паслугу» вызначэння месцазнаходжання чалавека па нумары яго мабільнага тэлефона. Такіх цуда-сайтаў дзясяткі, і ўсе яны нібыта выкарыстоўваюць тэхналогію GSM-пошуку. Для таго, каб скарыстацца «паслугай», абанентам прапануюць зарэгістравацца з дапамогай SMS, а затым адказаць на некалькі пытанняў. Пры гэтым за кожнае паведамленне здымаецца значная сума — а такіх SMS, як правіла, некалькі.

У выніку чалавеку дасылаюць спасылку на партал з агульнадаступнай інфармацыяй аб прыналежнасці таго ці іншага кода пэўнаму аператару сувязі або на сэрвісы інтэрактыўных картаў, такіх як Google Maps або Yandex Maps.

## І ЯШЧЭ РАЗ ПІЛЬНАСЦЬ

— Падборку найбольш распаўсюджаных схем тэлефоннага махлярства мы размясцілі на афіцыйным сайце МТС, распаўсюдзілі па СМІ і зрабілі рассылку для падпісчыкаў навін кампаніі, — паведаміла «Звяздзе» **прэс-сакратар «МТС» Таццяна КУРБАТ**.

***— Можа быць, мае сэнс выдаць яе ў выглядзе брашуры і раздаваць новым абанентам пры падключэнні?***

— Такой брашуры не плануецца, але пры падключэнні нашы кансультанты, асабліва калі бачаць, што чалавек з тэлефонам на «вы» і не вельмі добра валодае тэхнічнымі пытаннямі, абавязкова нагадаюць аб неабходнасці быць пільным і дапамогуць парадай. І, вядома, калі ў абанента ўзніклі сумненні ці падазрэнні, што ён ці яго блізкія сталі ахвярай падобнага махлярства, ён заўсёды можа звярнуцца па падтрымку ў офісы кампаніі.

■ Будзь у курсе

# ЦЫГАРЭТЫ ПАКІНЬ У КІШЭНІ, ВЕЛАСІПЕД ПАСТАЎ ПАД ПІКТАГРАМУ,

## альбо Што зараз павінны ведаць пасажыры цягнікоў?

**Згодна з унесенымі ў Правілы перавозак пасажыраў і багажу чыгуначным транспартам агульнага карыстання змяненнямі, забаронена курэнне ва ўсіх цягніках, акрамя цягнікоў міжнародных зносін.**

Сёлета Беларуская чыгунка будзе весці перавозкі з улікам вышэйназваных змяненняў, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. Асноўныя з іх датычацца афармлення, кошту і тэрміну дзеяння праязных дакументаў на цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа і гарадскіх ліній.

У тым ліку зменены тэрмін дзеяння разавых праязных дакументаў на цягнікі з ненумараванымі месцамі (гарадскіх і рэгіянальных ліній эканом-класа). Такія білеты з сёлетняга года сапраўдныя да дзвюх гадзін наступных сутак ад указанай у ім даты здзяйснення паездкі. За гэты перыяд праязны дакумент у абодва бакі дае права здзейсніць адну паездку «туды» і адну «назад» па ўказаным у білеце маршруце. Раней тэрмін дзеяння зваротных білетаў складаў фактычна двое сутак.

У сувязі са змяненнем парадку разліку кошту абанементных білетаў у цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа, нязначна павялічаны кошт месячных абанементных білетаў «на прад'яўніка» і «імянны льготны», якія зараз разлічваюцца, зыходзячы з 18 паездак «туды» і 18 паездак «назад» (раней — 17 паездак у кожны бок для абанементнага білета «на прад'яўніка» і 8 паездак — для «імяннога льготнага»). Павялічэнне колькасці паездак па «імянным ільготным» звязана з тым, што пры разліку кошту абанементнага білета прымяняецца тарыф з улікам зніжкі, што прадастаўляецца заканадаўчымі актамі.

У сувязі са змяненнем парадку разліку кошту павялічаны і кошт месячнага абанементнага білета «выхаднога дня». Пры гэтым тэрмін дзеяння ўказанага білета не змяніўся — ён сапраўдны на праезд па пятніцах, суботах, нядзелях, панядзелках, перадсвяточных і святочных днях па ўчастку, што ўказаны ў білеце, без абмежавання колькасці паездак.

Акрамя таго, устаноўлены асобны парадак праезду і афармлення праязных дакументаў на цягнікі гарадскіх ліній. Вызначана, што яны афармляюцца толькі ў білетных касах, размешчаных па маршруце руху гэтых цягнікоў. Уведзены новы від абанементнага білета «гарадскія лініі», які выдаецца на дэкаду, месяц, два месяцы, на тэрмін да аднаго года. За дэкадны абанементны білет гарадскіх ліній бярэцца плата з разліку 8 паездак «туды» і 8 паездак «назад», месячны — 22 паездкі «туды» і 22 паездкі «назад». Пры гэтым пасажыр мае права праязджаць па такім абанементным білеце без абмежавання колькасці паездак у перыяд тэрміну дзеяння, у тым ліку і ў цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа ў межах указанага ў білеце тарыфнага пояса. Вызначаны парадак перавозкі веласіпедаў і свойскіх жывёл — у спецыяльных месцах, абазначаных піктаграмамі.

Трэба адзначыць, што пастановай Мінэканомікі №90, якой, у прыватнасці, і ўнесены змяненні ў Правілы перавозкі пасажыраў і багажу чыгуначным транспартам агульнага карыстання, не прадугледжаны зніжкі для бацькоў з дзецьмі, а таксама для арганізаваных груп навучэнцаў, якія раней даваліся пры праездзе па тэрыторыі краіны ў перыяд з 1 кастрычніка па 30 красавіка. Звязана гэта са стратнасцю перавозак пасажыраў па Беларусі, удакладнілі ў прэс-службе Беларускай чыгункі.

У змененых Правілах перавозкі пасажыраў і багажу чыгуначным транспартам таксама вызначаны парадак праезду, афармлення і вяртання электронных праязных дакументаў. У тым ліку прадугледжана, што вяртанне грашовых сродкаў па ім ажыццяўляецца ў білетнай касе ў адпаведнасці з вызначанымі нарматыўнымі прававымі актамі правіламі вяртання пры прад'яўленні праязнога білета, афармленага на бланку строгай справаздачнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА**




## САМАЯ СМАЧНАЯ ГАРБАТА

Гэтая гісторыя здарылася ў той незабыўны час, калі мы, дзве маладыя настаўніцы, пасля ўніверсітэта пачыналі працаваць у вёсцы, жылі на кватэры, прычым проста ў раскошы (у параўнанні з іншымі), бо ваду з калодзежа не насілі — яна з крана цякла (хай сабе і толькі халодная), на вуліцу ў прыбіральню не бегалі...

Але ж да пары. Аднойчы, узімку, у маразы здарылася страшнае: парвала недзе трубу, у нашым доме знікла вада. І знікла, трэба разумець, надоўга, бо ад райцэнтра да вёскі аж 25 кіламетраў. Пакуль тыя рамонтнікі прыедуць, пакуль разбяруцца што да чаго, пакуль нешта зробяць...

Сталі думаць: што ж рабіць нам?

З аднаго боку, усё як быццам проста: вада — у калонцы. Але ж да яе, найбліжэйшай, метраў трыста ісці — не меней. З пустым вядром — палова бяды, а з поўным, ды па наледзі... Ваду тую можна і не данесці: бразнешся так, што піць не захочацца.

Пакуль жа — хацелася. Нават вельмі: нязменным атрыбутам нашых вячорак была гарбата. Яна саграваля, схіляла да шчырых размоў, да ўспамінаў... Дзеля іх чаго толькі не зробіш!

Мы з каляжанкай узялі вялікую балею, якая мелася ў гаспадыні, і пайшлі ў двор: міскамі зачэрпвалі снег і ссыпалі яго ў пасудзіну. Паўнюткую потым прыцягнулі дадому, паставілі ў кухні і сталі чакаць, калі той снег «паплыве».

Аднак ён — нічога падобнага — ляжаў, як на вуліцы, раставаць не збіраўся! Тады мы нагрэлі ў чайніку рэшткі вады, і плюхнулі ў балею. У выніку ў адным месцы снег трохі падтаў. І прадыктаваў нам цэлы тэхналагічны працэс. Запамінайце, можа, каму спатрэбіцца: кубкам чэрпаеш тое, што растала, выліваеш у чайнік, туды ж, даверху, набіваеш снегу, нясеш на пліту і грэеш. Вяртаешся назад, выліваеш у балею. Далей — усё паўтараецца.

Такім вось чынам, не менш чым за гадзіну мы атрымалі... трохлітровік вады, працадзілі яе праз марлечку, загатавалі, заварылі гарбату. І не абы якую, а найсмачнейшую ў свеце! Бо з цукеркамі!

А зрэшты... Такой добрай на смак яна, магчыма, падалася таму, што ніколі дагэтуль нам не даводзілася столькі працаваць, каб здабыць той літр вады.

**Вольга Данэйка,**
*г. Беразіно.*

## ПРЫВЫЧКА...

Да 50—60-х гадоў мінулага стагоддзя ўсіх вяскоўцаў у нашай мясцовасці сагналі ў калгасы. Аднаасобнік толькі адзін застаўся. Казалі, чаго толькі не выробляў, каб адчапіліся, нават вар'ятам прыкідваўся.

Але ж і выгаду потым меў. Ну вось да прыкладу. Хоча нехта каня ў калгасе ўзяць, каб агарод узараць, дроў прывезці ці сена якога. Кліча брыгадзіра ў хату, частуе, просіць. Ён жа — у залежнасці ад таго, з якой нагі ўстаў, — можа ласку зрабіць, даць таго каня, а можа і не даць. І тады ўжо хоць сам у плуг запрагайся! Альбо...

Альтэрнатыва была ў асобе ўсё таго ж дзядзькі Івана. Ён, маючы ўласнага каня, усё, што трэба, рабіў — і сабе, і іншым. Не за так, вядома ж: часам (калі рабіў штосьці у настаўнікаў альбо ў медыкаў) нават жывую капейку атрымліваў. Не тое што калгаснікі: дзень пры дні шчыравалі, а ўсяго і мелі, што пэўную колькасць працадзён (а папросту — палачак), за якія ў канцы года маглі мех-другі зерня выдаць...

У Івана ўсю бухгалтэрыю вяла жонка. Яна ў яго і старэйшая была, і ў сям'і галоўная. «Нарады» мужыку выпісвала, устанаўлівала расцэнкі, з ёю ж і разлікі потым вяліся. Івану заставалася самае цяжкае і самае прыемнае: працаваць амаль штодня ў так званых наймальнікаў, смачна палуднаваць ды дадому вяртацца калі з песнямі, а калі і з танцамі.

Вось так чалавек і жыў. Трэба сказаць, добразычлівым быў, паслухмяным, таму вяскоўцы яго паважалі. І шкадавалі, бо абрынулася на Івана гора: памерла яго распарадчыца, яго жонка! Удавец пасля гэтага як атручаны стаў хадзіць: па-ранейшаму трымаў гаспадарку, садзіў бульбу... Але ж як вольная гадзіна — гайда з дому, з падворка, да людзей, каб з некім пагаварыць, а то і чарку выпіць. Толькі з ёю Іван весялеў. І смялеў.

Па суседстве з ім, у сям'і дачкі, жыла тады адна бабуля, прыкладна такая ж па ўзросце. Зачасціў да яе ўдавец. А неяк, пасмялелы, уваліўся ў хату і...

Нездарма людзі кажуць: што ў цвярозага ў галаве, тое ў п'янога на языку. «Зося, выходзь за мяне замуж», — прапануе бабулі. У той ад неспадзеўкі аж дух заняло: «Ты што, Іван, з глузду з'ехаў? — пытаецца. — Які замуж? Я ж хворая зусім, старая... Я ж рабіць нічога не магу». «А нічога і не трэба, Зоська, — перапыніў яе Іван. — Я сам усё параблю! А ты... Ты толькі ў хаце будзь і мною камандуй!».

...Вось такім сфарміраваўся ў чалавека характар: не мог ён жыць самастойна — душа прасілася ў рабства.

**Ірына Рудкоўская,**
*в. Хатынічы,*
*Ганцавіцкі раён.*

## ХАЦЕЛА ЯК ЛЕПЕЙ

...Божухна, якімі ж доўгімі бываюць вечары ў самотных вясковых пенсіянераў! На вуліцу выйшаў бы — там анікога, спаць бы лёг — дык сон хоць вяроўкамі цягні. Адзінае выйсце — сабрацца ў некага ў хаце. І ўжо тады паплывуць успаміны пра даўно мінулае: як сядзелі некалі за калаўротамі ды кроснамі, як ткалі, як пралі, як шылі і вышывалі, якія цудоўныя выраблялі посцілкі, абрусы, ручнікі! Як доўга, як добра яны служылі — у тым ліку і на вяселлях: ручнікамі, як вядома, павязвалі сватоў, абрусамі засцілалі сталы... А ў нас — яшчэ і дзежкі пры сустрэчы нявесты.

— Той абрус як сёння я бачу, — успаміналa адна з нашых кабет. — Цётка Акуліна яго і ткала, і вышывала. Ружы на ім як жывыя былі — вачэй не адвесці... А чаму мне ў памяці? Акуліна тая ўдавой была, адна дзяцей гадавала, адна і вяселлі ім правіла. Ну, вядома ж, старалася, як ні цяжка было, усё прадумаць, зрабіць, прадугледзець...

Тады яна сына жаніла. З усім як быццам справілася. Чуе з вуліцы: «Едуць!», «Едуць!»... Гэта дзятва на ўсю вёску галёкае. І званочкі звіняць у коней пад дугамі.

Спыняюцца ля Акулінінай хаты. Малады саскоквае на зямлю, падае рукі сваёй абранніцы: злазь, маўляў. А яна, прыгожая, маладзейшая за яго на дванаццаць гадоў, пяюха на ўсё сяло, на зямлю ўніз паглядзела, нагою тупнула і як фыркне: «Не буду... Тут дзежкі няма». «Ды навошта яна? — пытае жаніх. — Я цябе і так зніму. Давай рукі!» «І не падумаю! — капрызіць ганарліўка. — Дзежку падавайце!.. Новым абрусам пакрытую». (Менавіта так сустракалі ў нас цнатлівых нявест)... «А божачка, а мілы мой! — спахапілася Акуліна. — А як жа я забылася?».. Куляй у хату. Дастае там з шафы найлепшы, новы абрус, выносіць з каморы дзяжу, перакульвае яе ўверх дном каля воза, засцілае... Усё, можна ступаць! Маладая і рада: адной рукой абаперлася на жаніха і — з гонарам за сваю перамогу — гоп на дзяжу... Аж дзвюма нагамі...

Цяжка сказаць: ці то пасудзіна была стараватая, ці то маладуха цяжкаватая... Але ж дно не вытрымала — праважілася. А следам — і дзеўка.

Рогату было — на ўсю вуліцу!.. Слоў усялякіх таксама. Першыя — самыя крыўдныя: маўляў, «чапаная», мусіць, дзеўка бракаваная...

Той, беднай, хоць скрозь зямлю праваліся, бо Богу ж душой не вінаватая! Ну хіба ў сваім ганарліўстве?

Схіліла яна твар да грудзей жаніха, той на рукі яе — і ў хату панёс.

...Вёска пасля гэтага, вядома ж, пашумела: нехта шкадаваў маладуху, нехта казаў, што гэта спецыяльна падстроілі, каб форс з яе збіць, хтось прадказваў маладым нядоўгае сумеснае жыццё. Але ж побач з сужэнцамі была працавітая і мудрая Акуліна. Дапамагала, чым магла, дзяцей гадавала, з хаты на чужыя языкі нічога не выносіла. Таму гэтая пара жыве і цяпер — праўнукаў у згодзе гадуе.

**Л. Н.,**
*Бярэзінскі раён.*

## ЗЯВАЙ, АЛЕ РОТ... НЕ РАЗЯВАЙ

Пра тое, што гучны смех ды пазяханне — прыкметы нявыхаванасці, вядома ўсім. А вось пра тое, што яны ж небяспеку тояць, баюся, не...

То непадалёк ад нас быў хутар. Жылі на ім баба Марыся і дзядуля Павел, гаспадарку трымалі, штосуботку чакалі гасцей — сваіх сыноў з сем'ямі. Тыя не ленаваліся ва ўсім дапамагаць ды і проста прыехаць любілі, пагасціць на малой радзімцы...

Так павялося, што жыццём там кіравала баба Марыся. Уставала яшчэ зацемна...

Вось і ў той раз прачнулася, пацягнулася на ложку, села, соладка пазяхнула і...

Нешта зрабілася: рот не закрываецца!

Яна да дзеда. Той прабудзіўся, вочы вырачыў, зразумець не можа, што гэта з бабай зрабілася? А тая, бедная, ужо да дзяцей у паніцы: неапранутая, растрапаная (ведама, толькі з ложка) — знай сабе мычыць, разявіўшыся ды пальцамі на рот паказвае.

Дзякаваць Богу, здагадаліся дзеці, што трэба яе да доктара везці. Мужчыны кінуліся на двор — каня запрагаць, маладухі-нявесткі ўпохапкі — адна з аднаго боку, другая — з другога, давай апранаць матулю, давай абуваць ды хустку завязваць...

Яшчэ і не развіднела як след, хворая ўжо ў бальніцы была — балазе, яна недалёка ад хутара ды і конік добры. Сядзяць у калідоры — чакаюць доктара. Той хворую ўбачыў — аж аслупянеў... Але ж сцяміў, у чым тут справа. Да бабулі падышоў і... кулаком ёй — у скіўцу. Сыны як усхопяцца... А ў маці — глядзяць — рот... закрыўся: валасы прыгладжвае, хустку папраўляе ды нявестак бэсціць: «Гэта ж падумаць, як яны мяне апранулі! У чым з хаты адправілі. І куды? Да доктара!».

Той аж не вытрымаў: «Цішэй трохі, цётачка, моцна крычаць я б вам не раіў — зноў можа скіўца выскачыць».

Карацей, дарога дамоў была ўжо куды весялейшая...

А там і жыццё пайшло сваім ходам. Вось толькі Марыся з той пары больш ніколі моцна не разяўлялася, гучна не крычала, нават размаўляць стала трохі цішэй, бо што: нездарма ж людзі кажуць, што сцеражонага Бог сцеражэ?

**Л. Вішнева,**
*Іўеўскі раён.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

■ Рэзананс

## НЕ РАСПЫЛЯЦЦА, А КАНЦЭНТРАВАЦЬ СІЛЫ І СРОДКІ ТОЛЬКІ НА ЗНАЧНЫХ ПРАЕКТАХ

**Тэмы, узнятыя на прэс-канферэнцыі кіраўніка дзяржавы, працягваюць абмяркоўваць не толькі палітыкі, чыноўнікі, СМІ, але і працоўныя калектывы**



**Мечыслаў ВІТКОЎСКІ, генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства «Рытм»:**

З пачутага на прэс-канферэнцыі мяне асабліва зацікавіў шэраг пытанняў далейшага развіцця айчыннай эканомікі — мадэрнізацыі прадпрыемстваў, інвестыцый, выкарыстання інавацыйных фондаў. Наша прадпрыемства занята ў галіне рэальнай эканомікі, і, як вытворца, я падтрымліваю ідэю кіраўніка дзяржавы, што ў цяперашніх ўмовах варта не распыляцца, а канцэнтраваць сілы і сродкі толькі на значных праектах па мадэрнізацыі. Няхай іх будзе няшмат, але гэта будуць толькі сапраўды эфектыўныя кірункі, якія і здольныя даць добры вынік.

Востра стаіць сёння і пытанне выкарыстання інавацыйных фондаў. І я пачуў добрае меркаванне — поўную адказнасць за канчатковую рэалізацыю праектаў тут павінны несці і кіраўнікі прадпрыемстваў, і мясцовыя ўлады. Павінны ставіцца канкрэтныя тэрміны — 2-3 гады на ўкараненне, не больш. А выдзеленыя сродкі ісці толькі па прамым прызначэнні. А то, бывае, пачынае рэалізоўвацца такі праект, на самім аб'екце яшчэ цішыня, а вось у кіраўніцкіх офісах тэрмінова распачынаецца суперсучасны рамонт, валам закупляюцца новыя аўтамабілі і аргтэхніка. Тым больш, у нас ідзе Год беражлівасці.

Актуальнае пытанне — і замежныя інвестыцыі. Размова пра іх даўно стаіць на парадку дня. На маю думку, тут патрэбна неадкладна зрабіць шэраг канкрэтных крокаў. Па-першае, кардынальна дэбюракратызаваць сам працэс, каб ён не палохаў сапраўдных добрасумленных інвестараў, якія прывыклі працаваць зусім у іншых умовах. Па-другое, павысіць адказнасць. Адказнасць і нашага боку, і інвестараў, якія ў любы момант могуць спакойна выйсці з праекта, пакінуўшы айчыннага партнёра ў вельмі незайздроснай сітуацыі. І, па-трэцяе, трэба больш шырока паказваць грамадскасці сапраўды цікавыя інвестыцыйныя праекты (як дзяржаўныя, так і прыватныя), асвятляць ход іх рэалізацыі ў сродках масавай інфармацыі. А вось тут я спадзяюся і на вашу газету. ■

■ Кватэрнае пытанне

## СУБСІДЫІ — У ПАРАДКУ ЧАРГОВАСЦІ

**Мы стаім у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў у сельскай мясцовасці. Але жыллё хацелі б набыць у суседнім раённым цэнтры і з выкарыстаннем аднаразовай субсідыі, на якую ў адпаведнасці з заканадаўствам маем права. Куды ў гэтым выпадку трэба звяртацца і які парадак выдзялення субсідыі?**

**А. Крук,** *Талачынскі р-н.*

Згодна з дзейным заканадаўствам субсідыя выдаецца ў парадку чарговасці, устаноўленай зыходзячы з часу прыняцця грамадзян на ўлік асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

Грамадзянам, якія маюць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі права на пазачарговае атрыманне субсідый, субсідыі выдаюцца ў парадку чарговасці, устаноўленай для адпаведных катэгорый грамадзян, зыходзячы з часу прыняцця іх на ўлік асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

Падставай для разгляду пытання аб магчымасці выдзялення субсідыі грамадзяніну з'яўляецца яго заява на імя старшыні мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, кіраўніка арганізацыі, у якіх грамадзянін знаходзіцца на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

Адначасова з заявай прэтэндэнт на атрыманне субсідыі падае ў службу субсідзіравання звесткі аб сукупным даходзе і аб маёмасным становішчы заяўніка і членаў яго сям'і, якія разам з ім паляпшаюць жыллёвыя ўмовы.

Грамадзянам, якія з выкарыстаннем субсідыі жадаюць пабудаваць або набыць жылыя памяшканні ў населеным пункце не па месцы знаходжання іх на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, памер субсідыі вылічваецца, зыходзячы з устаноўленага ў населеным пункце, дзе будуецца або набываецца жылое памяшканне, гранічнага нарматыву кошту будаўніцтва 1 кв. м агульнай плошчы жылых дамоў, якія будуюцца з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі, але не вышэй за ўстаноўлены ў населеным пункце па месцы выдзялення субсідыі гранічнага нарматыву кошту будаўніцтва 1 кв. м.

Спрэчкі, якія ўзнікаюць пры выдзяленні субсідыі, разглядаюцца вышэйшым мясцовым выканаўчым і распарадчым органам або судом у вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку.

**Віктар САВІЦКІ.**

## НЕ БОГІ ВАЛЁНКІ ВЫРАБЛЯЮЦЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**«За сваё рамесніцкае жыццё я абула ў валёнкі не тое што некалькі вёсак, паўраёна, — кажа жыхарка маленькай вёсачкі Пакуцце Марыя Асіпоўская.**

Дзякуючы Марыі Міхайлаўне і яе сыну Уладзіміру, іх суседзям-шапавалам гэты куточак Магілёўшчыны стаў добра вядомым на ўсю краіну. Па-першае, шапавальская традыцыя тут ніколі не перарывалася. А па-другое, гэтым майстрам-шапавалам надалі дзяржаўны статус захавальнікаў гэтай рамесніцкай традыцыі.

Калісьці Марыя Асіпоўская жыла ў Бешанковіцкім раёне, працавала манцёрам пуці на чыгунцы. Замуж выйшла ў Пакуцце і амаль трыццаць гадоў займаецца нялёгкаю ручною працаю — валеннем валёнак. Робіць іх з авечай поўсці, рознага памеру, белыя і чорныя. Якія каму падабаюцца.

«Калі чую, што мае валёнкі доўга носяцца, для мяне гэта лепшая з узнагарод», — кажа пакуцінская майстрыха.

*Дрыбінскі раён.*

■ Ведай нашых!

## МАРКА АБАВЯЗВАЕ

**Некалькі гадоў таму купіў я сабе халадзільнік «Атлант». Вядомая марка, добрая рэч, прэтэнзій да яе ніякіх. Дай, думаю, дачцэ падару. Яна якраз рамонт у кватэры зрабіла...**

І ўсё б з маім падарункам удала было, калі б пры перавозцы не згубілася фірменная наклейка. Суцяшаў я сябе: казаў, што на працы халадзільніка гэта, вядома ж, не адаб'ецца, на змесціве яго і тым больш! Але ж, як мне, дык неяк непрыемна было: не хацелася, каб суседзі маёй дачкі, яе госці думалі, што бацька ёй абы-што падарыў.

Пайшоў я ў нашу фірменную краму, папрасіў там, каб прадалі мне патрэбную наклейку. Адмовілі, прычым катэгарычна: маўляў, няма іх у продажы і ўсё тут.

Ледзьве ўгаварыў: далі нумар тэлефона аддзела маркетынгу завода-вытворцы. Патэлефанаваў туды — расказаў пра сваю непрыемнасць. І што вы думаеце: на трэці дзень у сваёй паштовай скрынцы канверт знайшоў, а ўжо ў ім — патрэбную наклейку! Ад радасці нават вершык склаў, што «на «Атланце», як вытворцы, усе працуюць вельмі творча — зборшчыкі, тэхнолагі... Найлепей — маркетолагі». Вось ім і хачу падзякаваць — за ўвагу, за тое, што зразумелі мой клопат.

**У.І. КРАСОЎСКІ,** *г. Орша.*

■ Уражанні

## «АБРАЗКІ, ЗНІТАВАНЫЯ РАЗАМ...»

**Адзін з найлепшых момантаў мінулага года: ну нарэшце — у руках у мяне кніга са звяздоўскаю «Простаю мовай»!**

Тэатр, як кажуць, пачынаецца з вешалкі. Кніга — з вокладкі. На гэтай — насцярожана-цікаўнае дзявочае вока. І адразу ж узнікае думка, што кожны чалавек прыходзіць у свет з верай у дабро, у шчырасць, у людскасць. Менавіта пра іх кніга Валянціны Доўнар «Каб сказаць... І пачулі».

Чытала яе — на першы погляд аб'ёмную (амаль 500 не маленькіх старонак) з адною думкай: толькі б не скончылася!.. Бо, здавалася, кожны абразок напісаны калі не для мяне, то ўжо пра — без сумневу: гэта я стаю ў краме ля касы, еду ў аўтобусе, гляджу тэлевізар, сяджу ў паліклініцы, чую размовы, гэта перад маімі вачамі ў трох-чатырох абзацах узаемаадносіны сужэнцаў, бацькоў і дзяцей, начальнікаў і падначаленых, гараджан і вяскоўцаў, гэта мне баліць душа за лёс гаротніцы-мовы, за безліч іншых хібаў жыцця...

Не можа не захапляць назіральнасць аўтаркі, яе гумар і выбар — уменне распавядаць менавіта аб тым, што цікавіць многіх... Да таго ж абрана для гэтага самая сучасная, самая запатрабаваная форма — мініяцюры, абразкі, тое, што дае падставы для самых сур'ёзных думак і пры гэтым абсалютна не вымагае часу. Гэта значыць, ёсць нейкая хвіліна — разгарні кнігу, пачытай, атрымай асалоду. І загарні, калі... зможаш.

Я, шчыра прызнаюся, не змагла, хоць большасць абразкоў чытала раней на старонках «Звязды». Але ж там яны друкаваліся не ў кожным нумары, а таму неяк рассыпаліся. Тут жа, знітаваныя ў адно цэлае, яны малююць карціну быцця — ва ўсіх яго фарбах!..

А яшчэ — яны даюць надзею. Надзею на перамогу цвярозага сэнсу, на трыумф дабрыні, на тое, што не сыдзе ў нябыт наша мова — сапраўды багатая, сапраўды мілагучная. І зусім не простая.

**А. БАЛОШКА,** *г. Мінск* ■

■ Пыталіся? Адказваем!

## ЦІ ПАВІНЕН ПРАЦАДАЎЦА АПЛАЧВАЦЬ СЕСІЮ ЗАВОЧНІКАМ?

**У нашу рэдакцыю звярнулася чытачка Аляксандра Іваніцкая з наступным пытаннем: «Я студэнтка 4-га курса БДУ, вучуся завочна і працую. Цяпер у нас сесія, мяне на яе адпусцілі, але за свой кошт. Скажыце, ці законна гэта і ці ёсць магчымасць здаваць сесію з захаваннем заработнай платы?».**

Гэтае пытанне цікавіць многіх студэнтаў-завочнікаў, таму мы звярнуліся з ім да **кансультанта юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Таццяны РАХУБЫ.**

— Наймальнік не абавязаны прадастаўляць студэнтам-завочнікам, якія працуюць, сацыяльны водпуск з захаваннем заработнай платы ў сувязі з навучаннем, — патлумачыла Таццяна Валер'еўна. — Але ў кожнага работніка ёсць працоўны водпуск (і адпускныя, што пры гэтым выплачваюцца), які прадугледжаны законам. Таму ў студэнта-завочніка пры здачы сесіі маюцца два варыянты: ён можа запланаваць свой працоўны адпачынак на час сесіі і атрымаць адпускныя альбо схадзіць у водпуск за свой кошт (сацыяльны адпачынак), а потым узяць працоўны водпуск у зручны для яго час.

Па словах Таццяны Рахубы, ёсць толькі два выпадкі, калі наймальнік можа аплаціць студэнту сесію. У адпаведнасці з абзацам першым арт. 214 Працоўнага кодэкса Беларусі наймальнік абавязаны прадаставіць вучэбны водпуск з захаваннем заработнай платы работніку, які навучаецца ў ССНУ або ВНУ на вячэрнім або завочным аддзяленні, пры наяўнасці наступных умоў:

— маецца напраўленне (заяўка) наймальніка, дагавор на падрыхтоўку гэтага спецыяліста;

— у калектыўным або працоўным дагаворы арганізацыі прадугледжаны прадастаўленне і аплата навучальных водпускаў. Пры гэтым работнік павінен атрымліваць першую вышэйшую або сярэднеспецыяльную адукацыю.

Калі названыя ўмовы адсутнічаюць, наймальнік мае права, але не абавязаны прадастаўляць работніку сацыяльны водпуск без захавання заработнай платы працягласцю, прадугледжанай арт. 216 Працоўнага кодэкса Беларусі.

**Святлана БУСЬКО** ■

### Наша даведка

*Водпуск бывае працоўным і сацыяльным. Да працоўнага адносіцца асноўны і дадатковы водпуск. Да сацыяльных — водпуск па цяжарнасці і родах, водпуск па доглядзе дзіцяці да трох гадоў, у сувязі з навучаннем, у сувязі з катастрофай на ЧАЭС, па ўважлівых прычынах асабістага і сямейнага характару.*

■ Кропкі над «і»

## ЗАСТУПНІК ЗА «ЗАЙЦОЎ» ПРАБАЧЭННЯ НЕ ПАПРАСІЎ

**Бадай, увесь Наваполацк і зараз успамінае гучную гісторыю аб тым, як у гарадскім аўтобусе пасажыр цягаў за валасы жанчыну-кантралёра. Гэта адбылося ў лістападзе мінулага года. Тады ў інтэрнэце з'явіўся відэазапіс таго інцыдэнту, зроблены адным з прысутных. І ў «сусветным павуцінні» пачалося шырокае абмеркаванне...**

А кантралёр усяго толькі і хацела аштрафаваць пасажырку, якая ехала без квітка. На тым роліку добра відаць, як за «зайку» потым «заступаўся» хлопец. Ён цягаў кантралёра за валасы, спрабуючы выпхнуць яе з салона на вуліцу.

Прадстаўнікам СМІ жанчына расказала, што правярала квіткі ў мужчыны і жанчыны, якія ехалі з дзецьмі. І калі малому, зразумела, квіток быў не патрэбен, старэйшаму, якому на выгляд гадоў дзевяць, білет трэба было купляць. На кантроль прад'явілі тры білеты, але адзін з іх быў несапраўдным. Безбілетніца прызналася, што гэта так, але плаціць штраф за праезд усё роўна адмовілася. Больш за тое — пачала розныя крыўдныя словы гаварыць. Кантралёр успамінала, што многія пасажыры пачалі заступацца за «зайку». Спачатку «зачапіў» адзін, потым другі пачаў за валасы цягаць...

Аб ходзе расследавання крымінальнай справы ў дачыненні да мужчыны, які ўчыніў супрацьпраўныя дзеянні падчас выканання кантралёрам сваіх працоўных абавязкаў, расказалі ў Следчым камітэце.

— Расследаванне адназначна паказала (крымінальная справа знаходзіцца на стадыі завяршэння), што 26 лістапада ў аўтобусе, які ехаў па маршруце №2 у Наваполацку, прыменена насілле ў дачыненні да жанчыны-кантралёра. У дзеяннях маладога чалавека ёсць склад злачынства. І адпаведны артыкул Крымінальнага кодэкса прадугледжвае пакаранне за прычыненне насілля ў дачыненні да асобы, якая выконвае свае службовыя абавязкі, — расказаў **Уладзімір ШАЛУХІН, начальнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці**. — Калі ты лічыш, што кантралёр дзейнічае непрафесійна, звярніся да наймальніка або выкладзі інфармацыю ў інтэрнэце. Але ўчыняць злачынства нікому не дазволена. Не буду забягаць наперад: толькі суд можа даць ацэнку наконт таго, ці была правакацыя з боку самога кантралёра. Шчыра кажучы, я гэтага не бачу. Работа ў кантралёраў складаная, людзі штрафы плаціць не хочуць. Ці карэктна дзейнічала пацярпелая, гэта ўжо іншая справа. Але адназначна яна не ўчыняла ніякага злачынства. Таму ўсе кропкі над «і» расставіць суд. На жаль, мужчына так і не прынёс прабачэнні пацярпелай, хаця зразумеў, што ўчыніў супрацьпраўныя дзеянні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПАДРУЧНІК... У ВАШЫМ МАБІЛЬНІКУ

**Першыя PDF-копіі школьных падручнікаў з'явіліся ў інтэрнэце.**

Як расказала журналісту «Звязды» **прэс-сакратар Міністэрства адукацыя Юлія ВАНІНА,** усяго ў навучальным працэсе зараз выкарыстоўваюцца 150 найменняў падручнікаў. Пакуль што ў адкрытым доступе толькі каля 50 падручнікаў, аўтары якіх ужо далі дазвол на размяшчэнне іх у інтэрнэце. З іншымі аўтарамі вядуцца адпаведныя перамовы.

Каб знайсці электронную версію патрэбнага падручніка, трэба зазірнуць у рубрыку «Навучэнцу» сайта Нацыянальнага інстытута адукацыі (www.adu.by) або на партал Міністэрства адукацыі (www.edu.gov.by) у раздзел «Навучэнцам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі». Школьнікі, гімназісты, ліцэісты ды і ўвогуле ўсе ахвотныя могуць бясплатна загружаць падручнікі на свае камп'ютары і выкарыстоўваць іх у любы час. Такім чынам аўтаматычна вырашаецца праблема цяжкіх школьных партфеляў. Да таго ж Міністэрства адукацыі плануе да канца 2013- 2014 навучальнага года стварыць адзіную электронную бібліятэку вучэбнай літаратуры.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Верш з канверта

*...Той свет даніну*
*зноў збірае:*
*Навіны горкія штодня —*
*Маіх вяскоўцаў забівае*
*Не землятрус і не вайна.*
*За чарадой ліхіх падзей*
*Ляжаць дачасна ў труне*
*Пад ціхі шэпт*
*паміж людзей:*
*«Хто не радзіўся —*
*не памрэ...»*
*Але ж —*
*аскомай на душы —*
*Пякельны, невыносны боль,*
*Бо ім бы жыць*
*яшчэ і жыць,*
*Каб не пракляты*
*алкаголь.*

**Любоў ЧЫГРЫНАВА,**
*в. Забалацце,*
*Вілейскі раён*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
## на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Кировске
## Организатор проведения аукциона – Кировский районный исполнительный комитет Могилевской области

| Адрес и площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб) | Сумма задатка (руб) | Расходы, связанные с формированием и регистрацией земельных участков (руб.) | Характеристика земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|
| г. Кировск, ул. Кирова, центральный рынок – 0,0031, торговый павильон № 1 (земельный участок для размещения объектов розничной торговли), срок аренды 25 лет | 722550100001002864 | 658 190 | 131 638 | 4 222 214 | Для всех участков – рядом электричество, централизованные водоснабжение и водоотведение. |
| г. Кировск, ул. Кирова, рядом с детским кафе – 0,0504, магазин по продаже товаров для спорта, туризма, охоты и рыбалки (земельный участок для размещения объектов розничной торговли), срок аренды 30 лет | 722550100001002890 | 12 604 960 | 2 520 992 | 4 490 700 | |
| г. Кировск, ул. Орловского, напротив ф-ла РУП «Могилевоблгаз», платная автомобильная стоянка (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей) – 1,00 га, срок аренды 25 лет | 722550100001002878 | 173 690 496 | 34 738 099 | 3 362 730 | |

**Аукцион состоится 28 февраля 2013 г. в 16.15 по адресу: г. Кировск, ул. Кирова, 80, 1 этаж, зал заседаний. Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (землеустроительная служба Кировского райисполкома) по адресу: г. Кировск, ул. Пушкинская, 21а, каб. 8 в рабочие дни с даты опубликования извещения до 17.00 22 февраля 2013 г. Заключительная регистрация участников аукциона 28 февраля 2013 г. с 15.00 до 15.30. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Кировске: (8 02237) 25 4 96 и по адресу: ул. Пушкинская, 21а, каб. 8.**

Для участия в аукционе на право заключения договора аренды земельного участка приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Участнику необходимо в срок, указанный в извещении, подать заявление и представить в уполномоченную организацию заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Кировского райфо 3602717000012 в ЦБУ № 709 г. Кировска филиал № 703 АСБ «Беларусбанк» г. Бобруйска код 760, код платежа 04002; кроме того, в комиссию представляется гражданином копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Аукцион проводится при наличии двух и более участников. Не допускается начало торгов по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Участник аукциона, ставший победителем, либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

- в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка и оплатить расходы по публикации извещения в средствах массовой информации;
- заключить с Кировским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;
- получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;
- приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;
- завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с земельными участками.

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

## Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»
**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ДОЛЬЩИКОВ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНЫЕ ДЕКЛАРАЦИИ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 22 по генплану» в г. Минске,** *опубликованные в газете «Звязда» от 18.08.2011 № 156, от 21.10.2011 № 201, от 08.12.2011 № 234:*

Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – январь 2013 года.

Заключение дополнительных соглашений будет осуществляться по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А, каб. 105.

*Генеральный директор* *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

## Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»
**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ДОЛЬЩИКОВ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса – пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану». (1 пусковой комплекс) в г. Минске,** *опубликованную в газете «Звязда» от 18.08.2011 № 156:*

Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – январь 2013 года.

Заключение дополнительных соглашений будет осуществляться по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А, каб. 105.

*Генеральный директор* *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

---

**Производственная компания ЧТУП «ОЛДИ СВЕТ»** УНП 191039087

*в связи с развитием производства и расширением рынков сбыта объявляет набор на вакансию*

**СПЕЦИАЛИСТА ПО ПРОДВИЖЕНИЮ ОБОРУДОВАНИЯ**

**Требования:** мужчина, образование высшее техническое, возможно Учреждение образования «Военная академия РБ», факультеты: **1.** ПВО. **2.** Связь и АСУ.

Наличие личного автомобиля приветствуется.

**Условия работы:** работа с проектными институтами, электромонтажными организациями РБ и РФ.

**ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА ВЫСОКАЯ. Проводится обучение.**

Просьба резюме высылать на e-mail: **oldisvet@mail.ru.** Тел. **+37529 697 73 41.**

Сайт организации: **www.oldisvet.by.**

---

## ООО «Арбитр», управляющий по делу о банкротстве – организатор торгов, СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ по продаже имущества частного предприятия «Наш Край»:

| № лота | Наименование лота | Начальная цена продажи лота | Шаг торгов (5%) | Задаток (5%) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Площадка рынка «Наш Край», инв. № 450/С-25002 (сооружение неустановленного назначения) (в состав сооружения входят: покрытие, бордюр тротуарный, бордюр дорожный, газонное покрытие, автомобильная парковка и т.д.)** | 834 065 100 р. | 41 703 255 р. | 41 703 255 р. |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

**Торги состоятся 22 февраля 2013 года в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.**

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: р/с 3012036435941 в ЦБУ № 422 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Слоним, код 152101689, МФО 153001369, УНП 590093379.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления **до 11.00 21.02.2013** по адресу: 230001, г. Гродно-1, а/я 27 или по факсу 8(0152) 526859.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов с победителем подписывается протокол и заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. В соответствии с п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Настоящее объявление содержит лишь общие характеристики предмета торгов. Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8(029)7831160, тел./факс 8(0152)526859. Ознакомиться с предметом торгов (площадкой рынка) можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Гродненская область, г. Слоним, ул. Тополевая, д. 22.

---

## ОАО «Лифтсервис»
**ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ГОДОВОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Собрание состоится 19 февраля 2013 г.**
**по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 5, 4 этаж, актовый зал.**

**Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45.**

**Начало работы собрания в 13.00.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2012 г. и основных показателях производственной программы и финансового плана на 2013 год.
2. Отчет Наблюдательного совета Общества.
3. Отчет Ревизионной комиссии Общества.
4. О выборах Наблюдательного совета Общества.
5. О выборах Ревизионной комиссии Общества.
6. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
7. О размере вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества.

*Наблюдательный совет Общества.*

УНН 100088852.

---

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ПО ОБЪЕКТУ
**«Строительство многофункционального комплекса с предприятиями торговли, общественного питания, бытового обслуживания №10 (по генплану) по ул. Янковского – Горецкого – Проектируемая»,** *опубликованную в газете «Звязда» 04.01.2012 года.*

**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 89, корпус 2, помещение 10, каб. 18, 41. ***Тел. 8 (017) 216 00 09.***

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются квартиры для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц.**

Стоимость 1 кв.м эквивалентна 1200 (одной тысяче двумстам) долларам США. По соглашению сторон, оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка. УНП 100070331

---

**ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске информирует о признании недействительными:**

- страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 8929193;
- квитанцию о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС № 3922153.

УНП 100706519

---

**Считать недействительными** страховые полисы филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Бресте: Квитанция 1СУ серия КВ с № 4124482 по № 4124490.

УНП 100706519

---

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ПО ОБЪЕКТУ
**«Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по генплану № 11 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко. Жилой дом № 11 по генплану. 1-я очередь строительства»,** *опубликованную в газете «Звязда» 13.12.2012 года*

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «Фармоэкспотех», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 22 ноября 2007 г. № 2720 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101472333.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220090, г. Минск, ул. Кольцова, дом 19, ком. 15.

Почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 89, кор. 2, пом. 10, каб. 18, 41. ***Тел. 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (029)708 46 64.***

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц:

При условии 100% единовременной оплаты – 2-, 3-, 4-комнатные квартиры по стоимости 1100 (Одна тысяча сто) долларов США.

Стоимость 1 кв.м 2-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1200 (одна тысяча двести) долларов США.

Стоимость 1 кв.м 3-, 4-, 5-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1150 (одна тысяча сто пятьдесят) долларов США. Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка.

УНН 101472333

---

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» СООБЩАЕТ,**
***что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»***
**29 января 2013 года ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

Повестка дня

1. О безвозмездной передаче в собственность Республики Беларусь имущества ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 18 января 2013 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 21 по 27 января т.г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 27 января 2013 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка, филиалов (отделений) по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 54 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

**Телефон для справок: 8(017) 229 64 54.**

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

---

# ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
## 19 февраля 2013 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей | Затраты на подготовку документации, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | площадка в районе центрального пляжа № 1 | 340100000001005306 | 0,0020 | организация мелкорозничной сезонной торговли | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | Ограничения в использовании в связи с расположением в прибрежной полосе р. Сож, охранная зона сетей и сооружений водоснабжения – 0,0003 га. | 5 | 813 820 | 162 000 | 3 803 282 |
| 2 | площадка в районе центрального пляжа № 2 | 340100000001005307 | 0,0020 | организация мелкорозничной сезонной торговли | | Ограничения в использовании в связи с расположением в прибрежной полосе р. Сож. | 5 | 813 820 | 162 000 | 3 790 500 |
| 3 | площадка в районе центрального пляжа № 3 | 340100000001005308 | 0,0020 | организация мелкорозничной сезонной торговли | | Ограничения в использовании в связи с расположением в прибрежной полосе р. Сож. | 5 | 813 820 | 162 000 | 3 792 788 |
| 4 | в районе улиц Физкультурная-Технологическая | 340100000002003825 | 0,1745 | строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров | | Ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений канализации – 0,0525 га, охранная зона сетей и сооружений газоснабжения – 0,0184 га. | 50 | 299 758 800 | 59 951 000 | 3 204 123 |
| 5 | район усадебной застройки Прибор, на пересечении улиц Телешовской и Тереничской (участок № 19 по ул. Телешовской и № 15 по ул. Тереничской) | 340100000006004751 | 0,2566 | строительство и обслуживание здания специализированного розничной торговли (объекта розничной торговли) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 43 440 890 | 8 688 000 | 2 424 551 |
| 6 | в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 5 по генплану, первая очередь застройки) | 340100000008003691 | 0,1814 | для строительства и обслуживания здания специализированного для бытового обслуживания населения (объект бытового обслуживания населения) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 129 978 570 | 25 995 714 | 2 721 985 |
| 7 | в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 2 по генплану, первая очередь застройки) | 340100000008003688 | 1,1656 | для строительства и обслуживания многофункционального комплекса с объектами культурно-просветительского и зрелищного назначения, физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, включая объекты общественного питания и торговли (объект неустановленного назначения) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 835 187 640 | 167 037 520 | 3 294 224 |
| 8 | в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 10 по генплану, 1-я очередь застройки) | 340100000008003692 | 0,1533 | для строительства и обслуживания здания специализированного розничной торговли (магазин смешанной торговли на 100 кв.м торговой площади), (объект розничной торговли) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 109 844 100 | 21 968 820 | 2 976 175 |
| 9 | в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 4 по генплану, 1-я очередь застройки) | 340100000008003690 | 0,2117 | для строительства и обслуживания здания специализированного общественного питания (объект общественного питания) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 151 689 450 | 30 337 890 | 2 823 210 |
| 10 | в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 3 по генплану, первая очередь застройки) | 340100000008003689 | 0,7277 | для строительства и обслуживания здания специализированного розничной торговли (универсам), (объект розничной торговли) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 521 419 040 | 104 283 808 | 3 207 824 |
| 11 | ул. 1- я Луначарского | 340100000008003732 | 1,1337 | для строительства и обслуживания многофункционального торгового комплекса (объекта розничной торговли) | | Ограничения в использовании – водоохранная зона р. Сож. | 50 | 2 191 460 270 | 438 292 000 | 7 026 614 |
| 12 | микрорайон 20 а | 340100000001005305 | 0,4800 | для строительства и обслуживания многофункционального комплекса с объектами культурно-просветительского и зрелищного назначения, физкультурно-оздоровительного назначения и бытового обслуживания населения (объект физкультурно-оздоровительного и спортивного оздоровительного назначения, бытового обслуживания населения) | | Ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения и канализации – 0,0400 га. | 50 | 952 613 510 | 190 522 000 | 4 196 890 |
| 13 | микрорайон № 20 а | 340100000001005287 | 0,2565 | для строительства и обслуживания здания специализированного для ремонта и технического обслуживания автомобилей | | Ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений канализации – 0,0035 га. | 50 | 264 107 450 | 52 821 000 | 3 379 290 |
| 14 | ул. Мазурова, в районе жилого дома № 70 | 340100000001005283 | 0,0875 | для строительства и обслуживания здания специализированного культурно-просветительского назначения или здания специализированного здравоохранения (объекта неустановленного назначения) | | Ограничения в использовании – охранная зона линий электропередачи, площадью 0,0105 га. | 50 | 228 087 730 | 45 617 000 | 3 052 489 |
| 15 | ул. Могилевская | 340100000003002618 | 1,1672 | для строительства и обслуживания многофункционального комплекса, включающего магазин продовольственных товаров, кафе, гостиничные номера, с возможным дополнительным размещением автозаправочной станции или автосалона с объектами технического обслуживания автомобилей | | Ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения – 0,0884 га, охранная зона сетей и сооружений канализации – 0,1360 га | 50 | 2 723 314 260 | 544 662 000 | 3 342 867 |
| 16 | ул. Народного Ополчения | 340100000003002656 | 0,2609 | для строительства и обслуживания здания специализированного розничной торговли (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | | Ограничения в использовании: охранная зона линий электропередачи, сетей и сооружений водоснабжения и канализации – 0,0281 га. | 50 | 638 018 581 | 127 603 000 | 5 124 603 |
| 17 | ул. Советская | 340100000001005408 | 0,0040 | для установки и обслуживания торгового павильона (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) по ул. Советская на остановке "ул. Чонгарской Дивизии" | | Земельный участок предоставляется с условиями согласования с администрацией Железнодорожного района г. Гомеля внешнего вида торгового павильона и благоустройства территории. Ограничения в использовании в связи с расположением в охранной зоне линий электропередачи, линий связи и радиофикации, сетей и сооружений газоснабжения, канализации. | 1 | 879 278 | 175 000 | 4 071 322 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту.

3. **Аукцион состоится 19 февраля 2013 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518, управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того, представляют:

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.5 представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.6 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 13 февраля 2013 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а (каб. № 4). Заключительная регистрация участников, допущенных к аукциону, состоится с 14.00 до 14.40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

Лоты №№ 1–15 выставляются на аукцион повторно. Извещения опубликованы в газете «Звязда» от 10.11.2012 г., 14.11.2012 г., 27.11.2012 г.

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27; факс: 77 48 85. Наш сайт – www.gorod.gomel.by**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 3 (173)

■ Кінакрокі

# ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНО ВЫЙГРАЕ

## Калі будуць вялікія тэмы і рэжысёры, здольныя за іх узяцца

**Штогод на студыі дакументальных фільмаў «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» ладзяць адмысловыя паказы дакументальных стужак для прэсы, крытыкаў і мастацтвазнаўцаў — знаёмяць з фільмамі, створанымі за апошні год.**

У 2012 годзе на «Летапісе» былі зроблены 24 дакументальныя карціны, над якімі працавалі 17 рэжысёраў.

Другая сусветная вайна, чарнобыльская катастрофа, Ігнат Абдзіраловіч, Уладзіслаў Сыракомля, Гомельскі цырк, Святлана Бень і кабарэ-бэнд «Срэбранае вяселле» і шмат стужак пра драматычныя, музычныя і лялечны тэатры. Паміж сабой гледачы нават жартавалі, што, паглядзеўшы ўсе фільмы, можна стаць сапраўдным прафесіяналам у мантажы і дэмантажы тэатральнай сцэны — так шмат было «тэатральных» стужак.

Адзін фільм сам па сабе — з'ява, артэфакт. Сукупнасць фільмаў — тэндэнцыя. Якія ж стылістычныя і тэматычныя тэндэнцыі назіраюцца ў беларускім дакументальным кіно студыі «Летапіс» за мінулы год? Што яны значаць і куды вядуць? Разам з карэспандэнтам «Звязды» разважаюць знаўцы і аўтары кінематографа.

### Мода на гісторыю

На студыі «Летапіс» штогод з'яўляюцца новыя імёны. Пры ўсіх асаблівасцях працы на дзяржаўнай кінастудыі моладзь сюды ўсё-ткі цягнецца, таму што тут — школа, традыцыя. Ды і дзверы для маладых тут заўжды адчынены. Сёння ва ўмовах найноўшых тэхналогій і мабільнасці інтарэс да дакументалістыкі расце. Даволі проста зняць на мабільную камеру нейкі эпізод з жыцця і прадаставіць яго ў адкрыты доступ усім карыстальнікам інтэрнэту. Як сёння працуюць на «Летапісе» ва ўмовах сучаснай мабільнасці; ва ўмовах таго, што чым далей, тым больш кожны чалавек можа стаць рэжысёрам, фатографам, музыкантам і г.д. (зноў-такі з-за даступнасці найноўшай прасунутай тэхнікі); ва ўмовах, калі ў свеце ў кінатэатрах ідуць дакументальныя фільмы і ставіцца пытанне нават пра выгаднасць пракату дакументальнага кіно (узгадайце нядаўнія «круглыя сталы» ў Расіі, прысвечаныя гэтаму пытанню і арганізаваныя Цэнтрам дакументальнага кіно DOC).


Кадр з фільма Кацярыны Махавай «Асаблівы тэатр. У пошуках шчасця».

Сярод стужак студыі «Летапіс» даволі істотная частка прысвечана гістарычнай тэме. Гэта і фільм Марыі Жукавай «Лёс старой кнігі» пра рукапісныя кнігі XVI-XIX стагоддзяў, што захоўваюцца ў Веткаўскім музеі; і 79-хвілінная стужка Яўгена Сяцько «Беларусь. 4 гады вайны», цалкам змантаваная са старой хронікі савецкіх ваенных кінааператараў і нават трафейных нямецкіх плёнак; і «Варвараўская свечка» Вольгі Дашук пра старадаўні народны абрад, што існуе ў вёсцы Басценавічы Мсціслаўскага раёна; і «Адвечным шляхам» Ірыны Волах — наогул, першы дакументальны фільм пра беларускага філосафа Ігната Канчэўскага (Абдзіраловіча); і «На манежы сёння і заўжды» Ігара Чышчэні пра гісторыю і сучаснасць Гомельскага цырка — стужка, зробленая ў вельмі сучаснай, нават трохі кліпавай стылістыцы (што надае якраз нейкай свежасці фільмам такога кшталту), з добрым дынамічным паміжкадравым і ўнутрыкадравым мантажом і цудоўным гукавым афармленнем і інш. Вядома, ёсць стужкі ўдалыя, а ёсць і не вельмі. Усе са сваімі нюансамі. Ад некаторых хочацца большай лаканічнасці, ад іншых — наадварот, больш грунтоўнага паглыблення ў тэму. Але кіно — гэта не толькі мастацтва, але і збег абставін. Зразумела, што часам не ўсё залежыць ад саміх стваральнікаў...

— Я думаю, што сёння студыя «Летапіс» у межах традыцыі рухаецца ў кірунку больш псіхалагічнага асэнсавання нашага жыцця. І пра ваенную тэму, вядома, нельга забывацца. У планах — фільмы пра афганцаў, вайну 1812 года, філаматаў ды філарэтаў. Будзем працягваць ствараць фільмы пра славутых людзей Беларусі — «Кінапантэон», — распавядае **Уладзімір МАРОЗ, вядучы рэдактар студыі «Летапіс».** — Але адначасова важна, каб у нашых стужках былі адлюстраваны сучаснікі, сённяшняе жыццё.

А гэта якраз і ёсць іншы падыход у працы студыі.

### Маладыя кадры

Гаварыць пра нейкія дакладна акрэсленыя тэндэнцыі ў дакументальным кіно студыі «Летапіс» складана, лічыць **Ірына ДЗЯМ'ЯНАВА, вядучы рэдактар студыі «Летапіс», дырэктар праграмы дакументальнага кіно кінафестывалю «Лістапад».** Але ёсць рэчы, не звязаныя з тэматычнымі або стылістычнымі асаблівасцямі:

— Што мы заўжды імкнёмся рабіць, дык гэта прыцягнуць маладых рэжысёраў і аператараў. Мы зрабілі гэта ў пазамінулым годзе, працягнулі ў мінулым. Сёння ўсе праекты, якія потым будуць рэалізаваны, праходзяць конкурсную камісію. І сёлета мы прадставілі некалькі праектаў маладых рэжысёраў. Там ёсць і дэбюты. І мы спадзяёмся, што іх зацвердзяць. Ёсць вельмі перспектыўная тэма. Яна належыць студэнту Акадэміі мастацтваў, які вучыцца ў майстэрні менавіта кінарэжысёраў дакументальнага кіно мэтра беларускай кінадакументалістыкі Міхаіла Жданоўскага. Практычна гэта другі ў гісторыі Акадэміі курс менавіта дакументальнага кіно, а не рэжысуры тэлебачання. Першы быў набраны больш за 20 гадоў таму, і яго выпускнікі працуюць сёння. Той курс набіраў Віктар Дашук. Гэта такі арганізацыйны бок справы. Але непасрэдна звязаны і з тэматыкай, і з тэндэнцыямі, таму што маладыя па-іншаму глядзяць на свет, валодаюць сучаснымі тэхналогіямі. А гэта вельмі важна ў дакументальным кіно. Гэта мабільныя камеры, фотаапараты, магчымасць пісаць гук у абсалютна іншых умовах, чым раней. І маладая энергетыка, погляд на сучаснасць, новыя тэмы, што хвалююць сёння маладых.

А што ж думаюць самі маладыя? Хто ён, беларускі рэжысёр-пачатковец і якая будучыня яго чакае? **Малады кінарэжысёр Ігар ЧЫШЧЭНЯ** скончыў Акадэмію мастацтваў тры гады таму. І на «Летапісе» паспеў ужо зрабіць некалькі стужак. Акрамя гэтага, Ігар робіць цікавыя праекты на прома-прадакшн студыі «Пан-студыя».

— Калі глядзець на тых, хто зараз працуе на «Летапісе» з маладых, то гэта хлопцы і дзяўчаты, якія скончылі Акадэмію ці курсы павышэння кваліфікацыі пры ёй. Але мне здаецца, што наша навучанне яшчэ працягваецца. У Акадэміі нам далі нейкія агульныя прафесійныя веды. А на студыі мы ўжо самі адказваем за сабе. Гэта ўжо больш сур'ёзна. Мы вучымся прымаць рашэнні. У прынцыпе, вучоба толькі пачынаецца, калі ты заканчваеш Акадэмію. Мы ўсе яшчэ ў пошуку сваёй тэмы. Нам шмат што цікава. Але як зразумець, ці будзе гэта цікава людзям?..


Кадр з фільма Яўгена Сяцько «Беларусь. 4 гады вайны».

Наконт будучыні — працы для рэжысёраў у краіне хапае. Усе мае сябры працуюць, і працуюць шмат. У асноўным гэта, зразумела, ТБ. Калі казаць пра мастацкае дакументальнае кіно, то на «Летапісе» ёсць цікавасць да маладых рэжысёраў. Кожны год некалькі дэбютаў. Дзверы там заўсёды адчынены. Калі мяне нехта просіць пазнаёміць з рэдактарам, я заўседы знаёмлю, а там ужо асабістая справа кожнага, зробіць ён фільм ці не.

Адносна кірунку развіцця студыі Ігар разважае так:

— Ёсць мэтры: Аслюк, Дашук, Жданоўскі, Адамовіч і іншыя, якія робяць збольшага аўтарскія праекты, на якіх і трымаецца аўтарытэт студыі. Часам і ў іх «праскокваюць» заказныя фільмы, але што тут такога — нічога заганнага.

### Вялікая тэма + вялікі рэжысёр

Сапраўды, аўтарытэт студыі заўжды трымаўся на вялікіх праектах і вялікіх, смелых аўтарах. Нездарма, менавіта беларускае дакументальнае кіно ў свеце добра ведаюць і любяць. Але сярод стужак мінулага года не сказаць, каб былі фільмы доўгайгральныя — тыя, якія арыгінальна, па-мастацку дасканала расказваюць нешта пра высокія сферы: беларускую ментальнасць ці наканаванасць, сутнасць чалавека наогул, сутнасць нашай сучаснасці. Ёсць цікавая стужка Віктара Аслюка «Мікалай Пінігін. Мяне няма» пра галоўнага рэжысёра Купалаўскага тэатра і пра тое, ці ёсць ён усё-ткі ў беларускім тэатры або ёсць толькі тэатр... Ёсць стужка (фільм-канцэрт?) «Неверагодная Бенька» Галіны Адамовіч, якая якраз нядаўна атрымала прыз Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне», пра рэжысёра і акцёра лялечнага тэатра, стваральніцу і ідэйную натхняльніцу гурта «Сярэбранае вяселле» Святлану Бень. Ёсць «Фермер з Брагіна» Мікалая Князева — цікавы фільм, які, праўда, тэматычна можна было б падзяліць на два: пра наступствы чарнобыльскай катастрофы і сённяшняе жыццё на тэрыторыях, дзе колькасць кюры зашкальвае; і пра складанае жыццё беларускіх фермераў, якім даводзіцца змагацца з рознымі адміністрацыйнымі і побытавымі перашкодамі. У гэтай карціне, можа, шмат чаго не хапае, але ёсць галоўнае — цікавы просты герой. Ёсць фільмы рэжысёра з вялікім патэнцыялам Кацярыны Махавай «Гісторыя Лёшы Крэчата» і «Асаблівы тэатр. У пошуках шчасця» пра людзей з абмежаванымі фізічнымі і разумовымі здольнасцямі. Пры дапамозе мантажу і музычнага аздаблення атрымалася сапраўды чуллівыя атмасферныя аўтарскія фільмы.

Праўда, добрая частка мінулагодніх фільмаў «Летапісу» мае непрыхаваны сацыяльны, публіцыстычны пафас. Мне такія фільмы (больш тэлевізійнага фармату) нагадваюць праблемныя журналісцкія артыкулы. Гэтыя стужкі добра паказаць па тэлебачанні, каб на праблему звярнула ўвагу грамадскасць і чыноўнікі, якія, калі захочуць, могуць нешта змяніць... Але праз некаторы час гэтыя фільмы страцяць сваю вострую актуальнасць і будуць цікавыя вузкаму колу даследчыкаў выключна як артэфакт. І тое — не факт. Напрыклад, стужка Марыны Корбут «Спыніся!» пра былых алкаголікаў, якія збіраюцца разам і кантактуюць, спрабуючы пераканаць адзін аднаго, што зноў зрывацца і сыходзіць у запой — не выйсце. Разам з іх развагамі гучаць словы спецыялістаў-нарколагаў. У тым ліку і пра тое, што ў нашай краіне ёсць шмат праблем з выцвярэзнікамі і рэабілітацыяй людзей, якія маюць алкагольную залежнасць.

— У мінулым годзе мы былі звязаны з конкурсам, які праходзіў упершыню. Патрэбны быў арганізацыйны вопыт і наш, і Міністэрства культуры. Па часе мы знаходзіліся ў нязручных умовах: шмат месяцаў пайшло на арганізацыйныя пытанні, — тлумачыць Ірына ДЗЯМ'ЯНАВА, — Кіно — гэта вельмі працаёмкі працэс. Ёсць, вядома, розныя падыходы, але... Летась часу на кіно ў нас было менш, чым звычайна. Таму большую частку карцін склалі кароткія стужкі па 13 хвілін. І не было вялікіх праектаў.

Я лічу, што дакументальнае кіно, калі яно працяглы час назірае за падзеямі, чалавекам, з'явай, грамадой людзей, заўжды выйграе. Таму што ў нас ёсць магчымасць назіраць за тым, як развіваецца сітуацыя, аналізаваць яе. Гэта заўжды цікава і амаль заўжды бяспройгрышны ход. У нас такіх магчымасцяў не было. Развіццё дакументальнага кіно і яго перспектывы звязаны з такімі вялікімі праектамі, якія дазваляюць узняць і нейкія глыбокія тэмы, і чалавека раскрыць усебакова. Адна справа, калі ты прыязджаеш і назіраеш за чалавекам тыдзень, іншая справа — калі назіраеш за яго жыццём паўгода-год. Але вялікія тэмы патрабуюць і гатоўнасці рэжысёраў за іх узяцца.

Наколькі нам удасца гэтую сітуацыю выправіць сёлета (хаця нехта, можа, і не лічыць, што трэба нешта выпраўляць), пакажуць вынікі конкурсу і самі фільмы. Але з майго пункту гледжання, мы павінны рухацца ў гэтым кірунку.

І, безумоўна, самае галоўнае — гэта пракат кіно, тое, што не асабліва ад нас залежыць. І нават не столькі пракат у кінатэатрах, хаця і ў гэтым кірунку ёсць некаторыя зрухі *(раз у месяц у фае кінатэатра «Цэнтральны» праходзіць «Клуб дакументальнага кіно». —* **Аўт.***)*, колькі паказы па тэлебачанні. Чаго ўтойваць: тэлеканалы не вельмі ўважліва глядзяць у наш бок. Відаць, спыніла існаванне нейкая традыцыя. Магчыма, мы нейкі час стваралі фільмы, якія іх не цікавілі. Ёсць і аб'ектыўныя цяжкасці: матэрыяльныя, тэхнічныя, абмежаванасць сродкаў, якія ёсць у тэлеканалаў на пакупку кіно. Але ў гэтым кірунку прабіцца нам вельмі хочацца. Усё-ткі гэта нацыянальнае кіно, жыццё краіны і лёсы беларусаў.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

### Меркаванне эксперта

**Наталля АГАФОНАВА, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт:**

*У нашай кінадакументалістыцы склалася, што называецца, школа. Таму побач даволі гарманічна (прынамсі, так выглядае звонку) суіснуюць розныя пакаленні рэжысёраў. І ў кожнага відавочныя адметнасці стылю.*

*Апірышчам для дакументальнага кіно з'яўляецца асоба рэальнага чалавека — тут вам і партрэт, і драма. І калі рэжысёр здолее «адкрыць» свайго героя для гледача, тады фільм становіцца мастацкім творам. Гэта, безумоўна, спрошчана-абагульненая фармулёўка. Яшчэ вельмі істотна знайсці выразны ракурс ды збудаваць адпаведную архітэктоніку карціны. І каб «загучала» яна ў паліфоніі вобразнай тыпізацыі. Але гэта ўзровень кінамастацтва. Таму стужкі сюды трапляюць адзінкавыя. Напрыклад, «Драўляны народ» Віктара Аслюка (2011).*

*Сярод фільмаў «Летапісу»- 2012 года такой сілы, на маё адчуванне, не было. Той жа Аслюк (інтуітыўны майстар) намагаўся наблізіцца да персоны Мікалая Пінігіна праз «код адсутнасці» (В. Акудовіч). Аднак не збалансаваў як след «модулі» маналагічнага выказвання свайго пратаганіста. Тым не менш, карціна вельмі актуальная, улічваючы той негатыўны кантэкст, які апошнім часам ахутвае персону выбітнага тэатральнага рэжысёра.*

*Кульмінацыйнай зонай праграмы можна назваць фільм Уладзіміра Дашука «Залатое вяселле». Што тычыцца самай нізкай кропкі (я дакладна разумею, што крочу на міннае поле), то для мяне, на жаль, гэта фільм Анатоля Алая «Без тэрміну даўніны. Бумеранг-2». На жаль, таму што Анатоль Алай — майстар дакументальнага фільма-даследавання — апошнія гады трапіў у пастку пэўнага кшталту тэматычнай кан'юнктуры.*

*У шэраг імёнаў «маладых» рэжысёраў вылучаю Наталлю Жамойдзік, Кацярыну Махаву, Юрыя Цімафеева.*

*Думаю, што агульны высокі творчы рэсурс, які ўласцівы нашай дакументалістыцы, дазваляе аўтарам выходзіць у «вялікае» (поўнаметражнае) кіно. Не баяцца, смялей паварочвацца да* ***жыццёвага лёсу беларускага чалавека****. Бо featured рознага кшталту «кінабуклеты» ды «кінавікіпедыі» — занадта малы фармат для персон кшталту Сыракомлі ці Абдзіраловіча. Таксама, як фільмы-«падарункі» да юбілею мастака, кампазітара, артыста...*

# ВЕЧНАЕ ДЫХАННЕ ЭКСПЕРЫМЕНТУ

## У Мінску і іншых гарадах Беларусі паказваюць, што кіно можа быць розным

Міжнародны фестываль кароткаметражнага кіно Cinema Perpetuum Mobile ў другі раз праходзіць у Мінску з 12 па 20 студзеня. Сёлета праграму фэсту складаюць эксперыментальныя стужкі з усяго свету як вядомых класікаў эксперыментальнага кіно (калі, вядома, слова «эксперыментальны» стасуецца са словам «класіка»), так і навічкоў і пачаткоўцаў: Норман Мак Ларэн, Стывен Валошын, Карл Браун, Тэадор Ушаў, Карл Лем'ё, Даічы Саіто, Ягор Чыканаў, Карын Брэк, Змітро Бандарчук, Дзяніс Кант, Лопэ Серыз і інш. А вядучым праграмы эксперыментальных фільмаў стаў П'ер-Люк Ваянкур, рэжысёр з Канады. Ён працуе ў галіне эксперыментальнага кінематографа, з'яўляецца заснавальнікам Інстытута даследаванняў кінематографа і куратарам шматлікіх відэапраграм, якія паказваюць ад Загрэба да Варшавы.

У асобнай секцыі прадстаўлены фільмы школ эксперыментальнага кіно Германіі і Аўстраліі, Швецыі і Францыі. Адмысловую праграму складаюць беларускія фільмы, сярод якіх заўважаны стужкі, напрыклад, Андруся Такенданга «Horad» у жанры баявік/пародыя/трылер/жахі; а таксама дакументальны фільм Арцёма Лобача «Простыя рэчы». Адным словам, галоўны прынцып Cinema Perpetuum Mobile — паказаць, што кіно можа быць розным. А таму ў конкурсных і пазаконкурсных праграмах фестывалю на 9 пляцоўках сталіцы (часткова праграмы дубліруюцца ў Лідзе) дэманструецца ўсё: ад сацыяльных ролікаў да радыкальна эксперыментальнага відэаарту.

Сацыяльны некамерцыйны фестываль Cinema Perpetuum Mobile трымаецца на прынцыпах самаарганізацыі, узаемадапамогі, адкрытасці, празрыстасці і дэцэнтралізацыі. Іншымі словамі, любы чалавек можа ўзяць удзел у арганізацыі фестывалю і назіраць, як гэта робяць іншыя. Таму ў наступным годзе — не губляйце свайго шанцу.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

*Больш інфармацыі пра фестываль на сайце www.filmfest.by*

■ Выстава

# РУЧНОЕ ДРЭВА

## Калі праз яго прамаўляе любоў

**Леанід Давідзенка любіў жыццё: яго праявы перакладаў у вобразы, вобразам хацелася надаць акрэсленыя рысы, адтачыць, вытачыць, стварыць вытанчаную форму дзеля цудоўнай з'явы. З'явы — скульптуры Леаніда Давідзенкі, якому прысвечана выстава ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва.**

Ён адзін з тых скульптараў, што гэты від мастацтва ў Беларусі імкнуўся развіваць, эксперыментуючы, ствараючы пэўны вобраз у матэрыяле, які мог несці рысы рэчаіснасці, а мог быць нават вельмі аўтарскім. Гэтую здольнасць скульптара Давідзенкі да асаблівай вобразнасці прыкмецілі яшчэ за савецкім часам: яго працы трапілі ў калекцыю «Траццякоўкі», яго працы знаходзяцца і ў калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Дарэчы, ён аўтар «Купалля», скульптуры, што знаходзіцца каля кінатэатра «Масква» ў Мінску. Але якія ён ні рабіў бы скульптуры — дзеля іх пастаяннага існавання ў пэўным асяродку ці для выстаў, па замове ці выключна дзеля творчасці, ён імкнуўся, каб яны адлюстроўвалі частку яго асабістага свету, у якім хацелася сказаць штосьці новае. А ў гэтым свеце ў яго быў любімы матэрыял — дрэва, такое па-беларуску мяккае, цёплае, але з характарам і ўнутраным голасам, які нібыта прамаўляў праз скульптурную форму. Нейкай нават інтымнай падаецца яго праца з дрэвам: нібыта ўзаемадзеянне дзвюх сутнасцяў, з якіх адна дапамагае другой праявіць сябе. Ствараць такое можна толькі з любоўю да матэрыялу і свету, у якім ён народжаны. Напэўна, гэта можна аднойчы адчуць. Хоць усё-такі важна навучыцца быць скульптарам — праз розныя матэрыялы ўмець данесці думку. Вучыцца яму было ў каго: тады ў беларускай скульптуры працавалі Анікейчык і Бембель, якія паўплывалі на будучага скульптара Давідзенку. А потым і ён сам стаў настаўнікам.

Памяць пра настаўніка, які пайшоў з жыцця заўчасна (страціўшы здароўе пасля перажытай трагедыі з адзінай дачкой) вырашылі ўвасобіць яго вучні. Насамрэч іх было вельмі шмат, тых, хто асвойваў майстэрства скульптара яшчэ нават з мастацкага вучылішча імя Ахрэмчыка, дзе не адно дзесяцігоддзе выкладаў Давідзенка. І вучняў было — не адно пакаленне. Некаторыя з іх ужо самі выкладчыкі — у мастацкай гімназіі ды Акадэміі мастацтваў. На выставе разам з творамі Давідзенкі — працы Аляксандра Фінскага, Аляксандра Шапо, Уладзіміра Слабодчыкава, Аляксандра Навасёлава, Наталлі Стрыжнёвай і іншых... Здаецца, гэта лепшы з варыянтаў ушанаваць настаўніка: разам з яго творамі паказаць свае, у якіх вялікая частка яго працы, яго інтэлекту, яго майстэрства, працягнутага ў творчасці тых, хто ідзе за ім.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

■ Дзеля памяці

# ТОЙ САМЫ ВЫСОЦКІ

## Беларускім прыхільнікам артыста прадставілі яго кнігі і пра яго

Кнігі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі раскрываюць дачыненні да нашай краіны вядомага ў савецкі час аўтара і выканаўцы, артыста тэатра і кіно, яго мясцовыя кантакты, моманты прыезду ў госці да сяброў і ўдзелу ў беларускіх фільмах. Такіх кніг не адна: айчынныя прыхільнікі творчасці Высоцкага імкнуліся зафіксаваць кожны момант жыцця артыста, збіралі ўспаміны пра яго, запісы, фотаматэрыялы.

Але чытачы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якія зойдуць на выставу: «Уладзімір Высоцкі. Дзякуй!», прымеркаванай да 75-годдзя артыста, могуць пазнаёміцца з кнігамі, якія прысвяцілі яму блізкія людзі і сябры — у прыватнасці, Марына Уладзі і Валерый Залатухін. Ёсць яшчэ і кнігі самога Высоцкага: не толькі асобныя зборнікі вершаў, але і Збор твораў у сямі тамах. Усяго на выставе каля 200 дакументаў, сярод якіх грампласцінкі, аўдыякасеты і нават сучасныя кампакт-дыскі. Дзякуючы ім пра аўтара і выканаўцу ўласных песень можа даведацца сучаснае пакаленне, якое не ведала, што значыць духам узвышацца над сістэмай.

■ Гастролі

# СКУЛЬПТУРЫ РАДЭНА АЖЫВАЮЦЬ

## «Ці не зашмат эротыкі?» — абураліся ў савецкі час крытыкі пастановак Якабсона

Харэаграфічны цыкл «Радэн» Санкт-Пецярбургскага акадэмічнага тэатра балета імя Якабсона будзе паказаны ў Мінску падчас гастроляў, якія пачнуцца 25 студзеня. За тры дні будзе магчымасць паглядзець тры спектаклі гэтага тэатра, кожны з якіх пакінуў свой след у гісторыі развіцця харэаграфіі.

Будзе ў гэтыя дні месца класічнаму балету «Лебядзінае возера» Чайкоўскага. Але тое, пра што мы можа быць ведаем менш і чаго няма ў нас у тэатры — гэта балеты «Радэн» і «Клоп», якія паставіў у 50-я гады мінулага стагоддзя Леанід Якабсон. Натхніўшыся творамі Радэна, ён стварыў лірычны цыкл мініяцюр на музыку Дэбюсі, Пракоф'ева, Берга, дзе артысты ў белых трыко падобныя на скульптуры. У той час як балет «Клоп» Шастаковіча — увасабленне гратэску і сатыры праз рухі. Імя пастаноўшчыка гэтых балетаў сёння носіць асобны тэатр балета, які быў створаны 42 гады таму і быў адзначаны такой прэстыжнай расійскай прэміяй, як «Залатая маска».

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Імпрэза

# ПАСЛЯ БАЛЮ

## Названы імёны лепшых беларускіх артыстаў оперы і балета



*«Лепшай салісткай балета» назвалі Ірыну Яромкіну, а «Лепшым оперным салістам» стаў народны артыст Беларусі Сяргей Франкоўскі. Артыстам уручылі прэміі на заключнай частцы балю, які адбываўся на стары Новы год, калі пераваліла далёка за апоўнач. Сапраўды, чароўная ноч для іх — з навагоднімі прэміямі ад БелСвісБанка.*

Зрэшты, на гэтым балі сваю частку прыемнасці мог атрымаць кожны з гасцей: падчас гала-канцэртаў узнагароды знайшлі тых, хто быў на балі ў нечым лепшым, ці не падобным да іншых, арыгінальным.

Вы думаеце: якая там можа быць арыгінальнасць на сучасных беларускіх балях? Гэта ж не тое, што ў далёкія часы, калі дамы адмыслова шылі сабе шыкоўныя сукенкі, а кавалеры былі галантнымі і з задавальненнем ішлі танцаваць паланэзы ды кантрадансы?.. О, як мы сябе недаацэньваем!.. Бо на нашы балі ў оперным (за чатыры гады іх правядзення) збіраецца публіка вельмі і вельмі падрыхтаваная — як знешне, так і па сутнасці. Знешне вы б адразу і самі зразумелі, куды патрапілі: дамы ў шыкоўных сукенках — ну дакладна князёўны. Кавалеры — бліскучыя, галантныя, з разуменнем, каго і куды суправаджаюць. І не толькі суправаджаюць — нашы сучасныя кавалеры, аказваецца, гатовы ўласна ўдзельнічаць у адраджэнні бальных традыцый. Сёлета баль у оперным сабраў больш за 1000 гасцей, і гэта публіка, якая ведае, навошта хадзіць на балі, якая ведае, якія танцы там у модзе, якая ўсе гэтыя танцы з задавальненнем выконвае.

Распарадчык балю Аляксандр Фурман толькі прамовіў: «Паланэз» — і пары на ўсё фае выстраіліся ў некалькі радочкаў, дружненька і сінхронна выконвалі ўсе патрэбныя рухі. Тых, хто жадаў прайсціся ў паланэзе, было на цэлыя два заходы. Вальс, кантраданс, полька... Як жа ўсё гэта прыгожа выглядала! Нездарма тэатр арганізаваў адмысловыя курсы для засваення танцаў для балю. Некалькі месяцаў людзі хадзілі на іх, каб разумець сутнасць рухаў, каб адточваць дакладнасць фігур, — рыхтаваліся, каб потым паказаць сябе, чакалі гэтага моманту. Урокі танцаў далі свой плён, і цяпер у нас на баль збіраюцца людзі дзеля таго, каб спачатку патанцаваць, а не толькі дзеля таго, каб паглядзець на тых, хто гэта робіць прафесійна. Вось бы яшчэ ў «Княжым балі» (паводле беларускай традыцыі) госці маглі ўдзельнічаць разам з артыстамі тых жа «Харошак»! І можа, калі асвоілі вальсы пад музыку Штрауса, то і пад «Полацкі сшытак» зможам праз некаторы час гэтак жа прыгожа танцаваць?..

Але ж, акрамя танцаў, на балі можа было і проста павесяліцца: музычны і паэтычны салоны наведаць, з усходнімі гадалкамі пафатаграфавацца, партрэт каханай замовіць. І атрымаць сваю порцыю ўдзячнасці ад гаспадароў — за актыўны ўдзел і адказную падрыхтоўку да балю. Таму што свае адзнакі атрымалі ўладальнікі лепшых карнавальных касцюмаў (вось дзякуючы ім можна было адразу дакладна зразумець, куды і чаму ты прыйшоў), лепшыя і актыўныя танцоры, самая вясёлая і самая рамантычная пара. Апошніх, дарэчы, вызначыць было зусім нескладана: згодна з традыцыяй, увесь вечар адзін з адным танцаваць могуць толькі маладажоны ці асобы, якія збіраюцца пажаніцца. А баль — тое месца, дзе пачуцці праяўляюцца: столькі прыгажунь навокал, а якія кавалеры!..

Галоўнае, каб кожны з нас меў магчымасць адчуць: час князёў і князёўнаў адышоў і сучасны баль — не для выбраных; на яго можна патрапіць, калі вельмі хочацца, і раз на год можна падарыць сабе такое задавальненне. Хоць на баль і запрашаюць, але ў тэатр жа трапляюць і па квітках...

**Ларыса ЦІМОШЫК**


Ірына Яромкіна атрымлівае ўзнагароду.


Сяргей Франкоўскі.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 31 января 2013 г. 132-го ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской центр недвижимости

## по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска

| № предмета торгов | Наименование объекта недвижимости, его адрес, описание, условия аукциона | Общ. пл. (кв. м) | Начальная цена, руб. |
|---|---|---|---|
| **УП «ЖРЭО Заводского района г. Минска», тел. 395 80 46, 291 55 11** | | | |
| 1. | Ул. Варвашени, 18, пом. 1Н. Помещение на цокольном этаже. Общий вход с жильцами. Имеется естественное освещение. Отсутствует отопление, санузел. Под административные цели (офис) | 13,8 | 1 380 000 |
| 2. | Пр. Партизанский, 32 корп. 2. Помещение на 1 этаже, общий вход с жильцами. Имеется естественное освещение, отопление, санузел. Под административные цели (офис) | 16,1 | 1 610 000 |
| 3. | Ул. Райниса, 9. Помещение на 1 этаже. Общий вход с другим арендатором. Имеется естественное освещение, отопление. Отсутствует санузел. Под бытовые услуги населению (кроме ремонта обуви, парикмахерской) | 26,2 | 2 620 000 |
| **УП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска», тел. 223 35 03** | | | |
| 4. | Ул. Плеханова, 72, здание коммунально-бытового обслуживания. Площади на 2-м этаже. Вход совместно с другими арендаторами. Имеется естественное освещение, водоснабжение, отопление. Под административное использование (офис) | 76,3 | 7 630 000 |
| 5. | Ул. Я. Лучины, 14. Помещение бытового обслуживания населения на 1 этаже отдельно стоящего здания. Имеется естественное освещение, отопление. Водоснабжение, санузел и вход совместно с другими арендаторами. Под административное использование (офис) | 16,0 | 1 600 000 |
| **УП «Ремавтодор Октябрьского района г. Минска», тел. 212 93 99** | | | |
| 6. | Ул. Казинца, 7а. Помещение № 31 на 2 этаже административного здания. Имеется естественное освещение. Вход совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис) | 10,9 | 1 090 000 |
| **УП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска», тел. 294 01 11** | | | |
| 7. | Ул. Карвата, 87, корп. 11. Отдельно стоящее здание. Имеется отдельный вход. Отсутствует естественное освещение, отопление, санузел, водоснабжение | 406,7 | 40 670 000 |
| **УП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска», тел. 285 72 92** | | | |
| 8. | Ул. Героев 120 дивизии, 15. Комната № 56 на 3 этаже. Имеется отопление. Естественное освещение отсутствует. Санузел совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис), склад | 32,5 | 3 250 000 |
| 9. | Пер. Инструментальный, 3. Комната № 210 на 2 этаже. Имеется отопление, естественное освещение. Санузел совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис) | 15,9 | 1 590 000 |
| **КУП «УКС администрации Первомайского района г. Минска», тел. 287 37 32, 287 37 36** | | | |
| 10. | Пер. Калининградский, 17. Комната на 1 этаже. Имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, санузел совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис). | 34,2 | 3 420 000 |
| **УП «ЖРЭО Советского района г. Минска», тел. 292 74 31** | | | |
| 11. | Ул. Куйбышева, 30. Помещение на 1 этаже жилого дома. Имеется отопление, санузел, естественное освещение. Вход совместно с жильцами дома. Под административные цели (офис) | 12,98 | 1 300 000 |
| 12. | Ул. Сурганова, 40. Помещение на 1 этаже жилого дома. Имеется отопление, санузел, естественное освещение. Вход отдельный. Требуется ремонт. Условие обязательного перепрофилирования за счет арендатора. Под торговый объект непродовольственной группы товаров, стоматологические, иные услуги медицинского характера с условием обязательного перепрофилирования за счет средств арендатора | 103,6 | 10 360 000 |
| **УП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска», тел. 204 30 46** | | | |
| 13. | Ул. Лобанка, 50. Помещение на 1 этаже жилого дома. Имеется естественное освещение, отопление, электроснабжение, водоснабжение и канализация, отдельный вход. Под торговый объект непродовольственной группы товаров | 17,1 | 1 710 000 |
| **УП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска», тел. 253 03 26** | | | |
| 14. | Ул. П. Глебки, 118, помещение на первом этаже отдельно стоящего здания. Имеется отдельный вход, отопление, водоснабжение, канализация. Под торговый объект непродовольственной группы товаров (фирменная торговля отечественными товарами) | 83,9 | 8 400 000 |
| 15. | Ул. Матусевича, 42. Площадь в фойе 1 этажа административного здания. Под вендинговый копировальный аппарат | 2,0 | 200 000 |
| **УП «ЖРЭО Центрального района г. Минска», тел. 203 79 43, 203 34 66** | | | |
| 16. | Старовиленский тракт, 28, корп. 1. Помещение на 11 (техническом) этаже. Имеется отопление, естественное освещение. Санузел отсутствует. Вход совместно с жильцами дома через подъезд. Под административные цели (офис), творческую мастерскую | 15,1 | 1 510 000 |
| **КУП «Минская спадчина», тел. 226 53 04; 226 47 34** | | | |
| 17. | Ул. М. Богдановича, 11. Помещение на 2-м этаже. Имеется отопление, естественное освещение, санузел и вход общий с другими арендаторами. Под торговый объект непродовольственной группы товаров | 69,32 | 6 932 000 |
| 18. | Ул. Троицкая набережная, 6. Помещение на мансардном этаже здания. Имеется отопление, естественное освещение, санузел и вход общий с другими арендаторами. Под административные цели (офис) | 45,73 | 4 573 000 |
| **ГУПР Мингорисполкома, тел. 219 00 78, 220 51 34** | | | |
| 19. | Тер. Подземные переходы, д. 13, пом. 2, ОТЦ «Столица». Площадь для размещения торгового объекта № 531, на пешеходной улице верхнего уровня 5 блока. Под банкомат | 1,0 | 100 000 |
| 20. | Тер. Подземные переходы, д. 13, пом. 2, ОТЦ «Столица». Площадь для размещения торгового объекта № 532, на пешеходной улице верхнего уровня 5 блока. Под торговлю печатной продукцией | 8,4 | 840 000 |
| 21. | Тер. Подземные переходы, д. 13, пом. 2, ОТЦ «Столица». Площадь для размещения торгового объекта № 351 (2,0*5,2), нижний уровень на пешеходной улице 3 блока. Под торговлю сувенирной продукцией, услуги по упаковке | 10,4 | 1 040 000 |
| 22. | Партизанский просп., подземный переход перед универмагом «Беларусь». Помещение № 7 в ТЦ «Партизанский». Имеется отопление, электроснабжение. Под торговый объект непродовольственной группы товаров | 9,2 | 920 000 |
| **ПКУП «Производственная база по улице Казинца», тел. 212 24 94, велком 641 61 87** | | | |
| 23. | Ул. Казинца, 42. Морозильная камера в здании хранилища консервной продукции. Отсутствует естественное освещение. Под склад продовольственных товаров | 219,9 | 22 000 000 |
| 24. | Ул. Казинца, 42. Комната охраны в здании хранилища консервной продукции. Отсутствует естественное освещение, отопление. Под административные цели (офис) | 6,1 | 610 000 |
| **УП «Партизанское», тел. 200 11 84** | | | |
| 25. | Ул. Стебенева, 2. Помещение в здании спец. складов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище). Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли | 208,2 | 20 820 000 |
| 26. | Ул. Стебенева, 2. Помещение в здании спец. складов, торговых баз, хранилищ. Отсутствует отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли | 650,2 | 65 020 000 |
| 27. | Ул. Стебенева, 2. Помещение в административно–хозяйственном здании. Отсутствует отопление. Требуется ремонт. Сдача в аренду до сноса зданий по ул. К. Либкнехта, 43, ул. Западная, 19а. Под административные цели (офис) | 18,8 | 1 880 000 |
| 28. | Ул. Стебенева, 2. Помещение в административно-хозяйственном здании. Отсутствует отопление. Требуется ремонт. Сдача в аренду до сноса зданий по ул. К. Либкнехта, 43, ул. Западная, 19а. Под административные цели (офис) | 13,8 | 1 380 000 |
| 29. | Ул. Стебенева, 2. Помещение в здании спец. складов, торговых баз (проходная). Отсутствует отопление. Требуется ремонт. Под административные цели (офис), склад, склад оптовой торговли | 9,9 | 990 000 |
| 30. | Ул. Стебенева, 2. Помещение в административно-хозяйственном здании. Сдача в аренду до сноса зданий по ул. К. Либкнехта, 43, ул. Западная, 19а. Под административные цели (офис) | 59,3 | 5 930 000 |
| 31. | Ул. Герасименко, 57. Помещение на 2 этаже административно-хозяйственного здания. Под административные цели (офис) | 19,5 | 1 950 000 |
| 32. | ст. метро «Октябрьская» ТЦ «Купаловский» *тел. 321 20 00.* Торговое место № 16. Под торговлю непродовольственными товарами | 6,3 | 630 000 |
| 33. | ст. метро «Октябрьская» ТЦ «Купаловский» *тел. 321 20 00.* Торговое место № 37. Под торговлю непродовольственными товарами | 5,6 | 560 000 |
| 34. | ст. метро «Октябрьская» ТЦ «Купаловский» *тел. 321 20 00.* Торговое место № 109. Под торговлю непродовольственными товарами | 4,0 | 400 000 |
| 35. | ст. метро «Октябрьская», ТЦ «Купаловский» *тел. 321 20 00*. Торговое место № 56. Под торговлю непродовольственными товарами | 5,8 | 580 000 |
| 36. | Ул. Белецкого, 28. Помещение в здании продовольственного магазина. Отдельный вход. Требуется текущий ремонт. Под административные цели (офис), склад оптовой торговли, магазин розничной торговли непродовольственными товарами, за исключением синтетических моющих средств, парфюмерно-косметических товаров | 41,3 | 4 130 000 |
| **КУП «Минсктранс», тел. 219 86 90, 219 86 13, филиал «Автобусный парк № 5», тел. 352 37 89** | | | |
| 37. | Ул. Одинцова, 69 А. Площадь на 1 этаже д/с «Запад-3». Под торговый автомат | 1,5 | 150 000 |
| **КУП «Минсктранс», тел. 219 86 90, 219 86 13, филиал «Автобусный парк № 6», тел. 340 37 11** | | | |
| 38. | Ул. Машиностроителей, 15. Площадь в производственном корпусе. Под кофейный автомат | 2,0 | 200 000 |
| **КУП «Минсктранс», тел. 219 86 90, 219 86 13, филиал «Троллейбусный парк № 4», тел. 252 21 43** | | | |
| 39. | Ул. Одоевского, 113. Площадь на 1 этаже диспетчерской станции. Под торговый автомат | 1,5 | 150 000 |
| **КУП «Минсктранс», тел. 219 86 90, 219 86 13, филиал «Троллейбусный парк № 5», тел. 296 49 22** | | | |
| 40. | Ул. Калиновского, 105А. Площадь на 1 этаже д/с «Калиновского». Под торговый автомат по продаже штучных товаров в индивидуальной упаковке | 1,5 | 150 000 |
| 41. | Ул. Руссиянова, 51. Площадь на 1 этаже д/с «Уручье-2». Под торговый автомат по продаже штучных товаров в индивидуальной упаковке | 1,5 | 150 000 |
| **Управление культуры Мингорисполкома, тел. 243 94 71 Учреждение «Новый драматический театр г. Минска», тел. 243 94 71** | | | |
| 42. | Ул. Л. Чайкиной, 16. Помещение буфета с подсобными помещениями и частью фойе на 2 этаже здания театра. Имеются все коммуникации, запасный выход. Под буфет | 47,0 | 4 700 000 |
| **Комитет по образованию Мингорисполкома, тел. 306 43 88 ГУ «Центр физкультурно-оздоровительной работы Заводского района г. Минска», тел. 345 92 47** | | | |
| 43. | Ул. Шабаны, 10. Помещение на 2 этаже здания. Имеются естественное освещение, отопление, горячее и холодное водоснабжение (умывальник). Санузел и вход совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис) | 6,58 | 658 000 |
| **Комитет по образованию Мингорисполкома, тел. 306 43 88 УО «Минский государственный профессиональный технический колледж кулинарии», тел. 295 02 25** | | | |
| 44. | Ул. Строителей, 1. Помещение на 1 этаже корпуса №3 колледжа. Имеется отопление, естественное освещение, общий вход и запасный выход. Под склад | 276,6 | 27 660 000 |
| **Комитет по здравоохранению Мингорисполкома, тел. 223 70 89 УЗ «Минский городской центр реабилитации детей с психоневрологическими заболеваниями», тел. 327 43 45** | | | |
| 45. | Ул. Володарского, 1. Площадь на цокольном этаже главного корпуса. Под автомат по продаже бахил | 2,0 | 200 000 |
| 46. | Ул. Володарского, 1. Площадь на цокольном этаже главного корпуса. Под кофейный автомат | 2,0 | 200 000 |
| **Комитет по здравоохранению Мингорисполкома, тел. 223 70 89 УЗ «2-я городская поликлиника Фрунзенского района г. Минска», тел. 254 68 40** | | | |
| 47. | Ул. Якубовского, 33. Площадь на 1 этаже здания поликлиники. Под торговый объект по продаже лечебной косметики, диетического питания, товаров для здоровья | 3,45 | 345 000 |
| **ТКУП «Минский Комаровский рынок», тел. 331 42 62, 331 84 00** | | | |
| 48. | Ул. В. Хоружей, 8. Территория крытого рынка, 1 этаж, ряд 16, сектор 4, павильон № 4. Под торговый объект (продовольственная и непродовольственная группа товаров) | 50,5 | 5 050 000 |
| **Государственное унитарное торговое предприятие «Ровесник», тел. 216 89 57** | | | |
| 49. | Ул. Ольшевского, 76а. Помещение на 1 этаже административно-хозяйственного здания. Имеется естественное освещение, отопление, санузел и вход совместно с другими арендаторами. Под склад | 34,7 | 3 470 000 |
| **УП «Бытэкс», тел. 306 28 41** | | | |
| 50. | Ул. Московская, 20, смежные помещения №№ 16, 17 на втором этаже, отсутствует естественное освещение. В здании имеется отопление, энергоснабжение, водоснабжение, канализация. Под административное использование (офис), производственное использование | 10,9 | 1 090 00 |
| **ПТКУП «Чайка», тел. 281 24 19** | | | |
| 51. | Ул. Кнорина, 55. Площадь в холле на 1 этаже административного здания. Под кофейный автомат | 2,0 | 200 000 |
| 52. | Ул. Одоевского, 103а. Площадь на 1 этаже в помещении прачечной № 12. Под кофейный автомат | 2,0 | 200 000 |
| **УП «Городские бани», тел. 222 08 92** | | | |
| 53. | Ул. Маневича, 14. Помещения на первом этаже в отдельно стоящем здании бывшей бани в/ч. Имеется естественное освещение, электроснабжение. Требуется капитальный ремонт помещений и кровли. Под производственные цели, склад | 66,9 | 6 700 000 |
| 54. | Ул. Космонавтов, 56. Помещения (12,1 и 6,4 кв.м) на 2 этаже в БОК «Малиновка». Имеются естественное освещение, водоснабжение, канализация, отопление, электроснабжение. Под административные цели (офис) | 18,5 | 1 850 000 |
| 55. | Ул. Марьевская, 5. Помещение на 3 этаже в БОК «Лазня». Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение, водоснабжение. Под административные цели (офис) | 12,9 | 1 290 000 |
| 56. | Ул. Марьевская, 5. Помещение на 3 этаже в БОК «Лазня». Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение. Под административные цели (офис) | 11,0 | 1 100 000 |
| 57. | Ул. Марьевская, 5. Помещение на 3 этаже в БОК «Лазня». Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение, водоснабжение (душевая кабина). Под административные цели (офис) | 14,5 | 1 450 000 |
| 58. | Ул. Марьевская, 5. Помещение на 3 этаже в БОК «Лазня». Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение. Под административные цели (офис) | 9,2 | 920 000 |
| 59. | Ул. Украинская, 1. Помещение на 2 этаже в бане № 9. Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение. Под административные цели (офис) | 7,35 | 735 000 |
| 60. | Ул. К. Либкнехта, 77а. Помещения банного комплекса с бассейном в одноэтажном здании. Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение, канализация. Под оказание банно-оздоровительных услуг | 71,2 | 7 120 000 |
| **ГПО «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома», тел. 233 74 31 УП «Минскводоканал», тел. 233 91 38, 327 37 04** | | | |
| 61. | Ул. Инженерная, 1. Отдельно стоящее здание насосной станции технического водоснабжения № 2 с подземной частью. Имеется отопление, энергоснабжение, водоснабжение, канализация. Под склад | 224,7 | 22 470 000 |
| **ГПО «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома», тел. 233 74 31 УП «Экорес», тел. 344 27 81, 344 20 32** | | | |
| 62. | Ул. Шишкина, 23а. Металлический павильон. Под пункт приема стеклотары, вторсырья | 34,0 | 3 400 000 |
| 63. | Ул. Никифорова, 23а. Металлический павильон. Под пункт приема стеклотары, вторсырья | 22,0 | 2 200 000 |
| **ОАО «Стройтрест № 4» филиал «ЖКК», тел. 280 26 96** | | | |
| 64. | Ул.П.Бровки, 32. Помещение на 1 этаже 2-этажного административного здания. Имеется отопление, электроснабжение, естественное освещение. Санузел и вход общий с другими арендаторами. Под административные цели (офис) | 15,3 | 1 530 000 |
| 65. | Ул.П.Бровки, 32. Помещение на 1 этаже 2-этажного административного здания. Имеется отопление, электроснабжение, естественное освещение. Санузел и вход общий с другими арендаторами. Под производственные цели по согласованию с балансодержателем | 15,99 | 1 600 000 |
| **УП «Механизированная уборка города», тел. 207 20 59** | | | |
| 66. | 2-ой Прилукский пер., 8. Кабинет, смежный с кабинетом арендодателя (8 кв.м) на 4-м этаже административно-бытового здания. Имеется отопление, электроснабжение. Отсутствует естественное освещение, телефон. Санузел и вход общий с другими арендаторами. Под административные цели (офис) | 11,5 | 1 150 000 |
| **КДУП «Цветы столицы», тел. 506 04 86** | | | |
| 67. | Ул. Монтажников, 27. Помещения в отдельно стоящем специализированном здании. Требуется капитальный ремонт помещений, коммуникаций и кровли. Под производственные цели, склад, по согласованию с балансодержателем | 265,8 | 26 580 000 |
| **КУП «Гаражи, автостоянки и парковки», тел. 252 06 14** | | | |
| 68. | Ул. В. Хоружей, 1А, пом. 608. Помещение транспортного назначения. Имеется естественное освещение, отсутствует отопление, водоснабжение, канализация. Для оказания услуг по хранению транспортных средств | 2 998,2 | 60 000 000 |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости» (далее – Центр недвижимости), г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Аукцион состоится **31 января 2013 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомлении с имеющейся документацией осуществляется по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 с 21 по 29 января 2013 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам – до 16.45).**

**Задаток для участия в аукционе должен быть внесен до 17 часов 30 минут 29 января 2013 г.**

**Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Срок договора аренды 5 лет.**

Для осмотра объектов недвижимости, право заключения договоров аренды которых выставлено на аукцион, необходимо в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, в рабочее время обращаться к арендодателям по телефонам, указанным в настоящем извещении. Организатор аукциона рекомендует участникам аукциона при осмотре объекта недвижимости уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам), а также соответствующий планируемому виду деятельности размер арендной платы.

**К участию в торгах по предметам торгов, целевое использование которых предусматривает осуществление предпринимательской деятельности, допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в торгах лицо, желающее участвовать в торгах, в течение срока, установленного для приема документов для участия в аукционе, подает заявление на участие в торгах по установленной форме (бланки заявлений – у организатора аукциона) со следующими документами:

• заявление об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги, по установленной форме (бланки заявлений – у организатора аукциона);

• копия платежного поручения о внесении задатка (без НДС) участником аукциона в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона (назначение платежа – задаток для участия в аукционе) на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости»;

• гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования (паспорт, страницы 31, 33 и страница с регистрацией места жительства (пропиской));

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• юридическим лицом Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования (**копии свидетельства о государственной регистрации и устава, при необходимости копию контракта с руководителем**), документ с указанием банковских реквизитов юридического лица (**информационное письмо**), **документ о назначении руководителя**;

• иностранным гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность;

• представителем иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

**При подаче документов** на участие в торгах граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц **предъявляют документ**, удостоверяющий личность (паспорт).

При отсутствии у граждан, индивидуальных предпринимателей текущего (расчетного) счета, он должен быть открыт в учреждении банка до подачи заявления на участие в торгах и указан в соответствующем заявлении.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в торгах, несут лица, желающие участвовать в торгах.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке задаток и заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов по установленной форме (бланки соглашений – у организатора аукциона, заполняются в двух экземплярах).

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение **5 рабочих дней со дня проведения аукциона**.

Также победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить Центру недвижимости затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (далее – возмещение расходов). Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

Договор аренды с победителем аукциона (приобретателем предмета аукциона) заключается в установленном порядке после выполнения им условий по оплате стоимости предмета аукциона и возмещения расходов Центру недвижимости, **но не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения аукциона**.

В соответствии с Инструкцией о порядке сдачи в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 16.12.2009 № 271, договор аренды недвижимого имущества с победителем аукциона (приобретателем предмета аукциона) заключается на основании решения Мингорисполкома о сдаче в аренду этого имущества **сроком на пять лет**.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель вправе до получения соответствующего решения Мингорисполкома заключить с Победителем аукциона договор аренды в соответствии с законодательством на срок до 2 месяцев.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель подает в комиссию Мингорисполкома по упорядочению использования зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, заявление о согласовании сдачи недвижимого имущества в аренду и условия договора аренды. Заявление должно быть подписано арендодателем и победителем аукциона, а по объектам, находящимся в хозяйственном ведении ЖРЭО администраций районов г. Минска, согласовано с администрацией района г. Минска, на территории которого расположено недвижимое имущество.

**Телефон для справок (017) 327 40 22.**
**Интернет: www.mgcn.by.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Тыдзень пройдзе паспяхова, калі здолееце захаваць прыўзняты настрой. Не дазваляйце сабе расслабіцца: гэтым могуць скарыстацца. Пазаслужбовыя адносіны з калегамі таксама не рэкамендуюцца. Магчымыя праблемы могуць прымусіць адступіць, лічыце гэта манеўрам і не апускайце рук, калі нават давядзецца пачынаць усё нанова.

**ЦЯЛЕЦ.** Тыдзень абяцае прайсці досыць спакойна. Даўно задуманыя планы пачнуць рэалізоўвацца. Усе ранейшыя канфлікты будуць, нарэшце, станоўча ўладжаны. Не выпускайце залаты час, паспрабуйце выкарыстоўваць яго па максімуме для свайго духоўнага і прафесійнага росту

**БЛІЗНЯТЫ.** На працы вас можа чакаць поспех, у шматлікіх справах вы акажацеся проста незаменныя. Важна правільна спланаваць дзеянні, каб захаваць сілы. Адчуўшы прыліў энергіі, не варта хапацца за шмат спраў адразу — лепш спыніцца на чымсьці адным, найбольш значным.

**РАК.** Тыдзень можа прынесці новыя цікавыя прапановы. Перш чым рашуча дзейнічаць, усё добра прадумайце. Пастаўцеся з увагай да дэталяў. Пажадана не праяўляць нецярплівасць да некаторых службовых праблем, інакш усе справы пойдуць наўскасяк. Узрасце ваш аўтарытэт і ўплыў на навакольных. Вы адчуеце ўпэўненасць ва ўласных сілах і зможаце выканаць складаную і адказную працу.

**ЛЕЎ.** Будуйце з сябрамі і аднадумцамі планы на будучыню. Спрыяльнае праектаванне сумесных прадпрыемстваў — ім практычна забяспечана выдатная будучыня. Абапірайцеся на старыя сувязі і правераных людзей. Не спяшайцеся з пачаткам актыўных дзеянняў, лепш займіцеся выпраўленнем памылак і недахопаў.

**ДЗЕВА.** Неўтаймоўная энергія не дазволіць уседзець на месцы. Найлепшым чынам будзе атрымлівацца арганізатарская дзейнасць. З'явіцца магчымасць павярнуць на карысць сабе любы збег акалічнасцяў, калі падыдзеце да справы без мітусні. Навакольныя будуць часцей заўважаць і ацэньваць вашы здольнасці. З другой паловы тыдня пачнецца цікавы перыяд, які парадуе з'яўленнем новых сяброў.

**ШАЛІ.** Можаце раскрыць свае здольнасці і творчы патэнцыял. Поспех будзе спадарожнічаць. Вы адчуеце прыліў сіл і актыўнасці і таму зможаце выканаць усякую працу, за якую возьмецеся. А шмат неадкладных спраў забяспечана. Адзінае, ад чаго варта ўстрымацца, дык гэта ад удзелу ў новых праектах, нават калі яны вельмі прывабныя.

**СКАРПІЁН.** На пачатку тыдня пажадана не пачынаць новых глабальных праектаў, лепш выдаткаваць пару дзён на завяршэнне назапашаных спраў. У калектыве чакаецца разброд і хістанне, і толькі ад вас калегі па працы могуць чакаць мудрага рашэння. Больш давярайце людзям — яны не такія дрэнныя, як вам здаецца. Варта падтрымаць калег, бо іх ідэі сапраўды арыгінальныя і своечасовыя.

**СТРАЛЕЦ.** Выдатны тыдзень для разумовай працы, камандзіровак і вандраванняў. Проціпаказана мітуслівасць. Рабіце ўсё павольна, калі жадаеце пазбегнуць перанапружання і нервовых зрываў. Злёгку запушчаная хатняя гаспадарка мае патрэбу ва ўвазе і абнаўленні.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень спакойны, але залішне расслабляцца не варта. Навакольныя будуць падтрымліваць вас, сябры складуць кампанію ў справах, але і самім трэба што-небудзь рабіць. Важна не быць пасіўным: лежачы на канапе, вы не даможацеся нічога, у той час як актыўнасць прынясе сапраўдны поспех.

**ВАДАЛЕЙ.** Апатыя і безуважлівасць пачатку тыдня ў другой палове зменяцца бадзёрым настроем, аптымізмам і актыўнасцю. Верагодная вялікая нагрузка на працы. Ваша тытанічная работа будзе ацэнена начальствам і калегамі, вас будуць любіць і паважаць. Рыхтуйцеся да мноства кантактаў, новых сустрэч і цікавых прапаноў.

**РЫБЫ.** Вас чакаюць перспектыўныя сустрэчы. Можаце атрымаць пахвалу з боку кіраўніцтва за свае распачынанні. Паспрабуйце быць сабранымі і акуратнымі, праяўляць цярпенне і вытрымку. Толькі тады навакольныя змогуць станоўча ацаніць вашы творчыя задумы. Уважліва пастаўцеся да дэталяў, якія будуць узнікаць на працягу ўсяго тыдня. Праявіце больш самастойнасці ў справах і настойлівасці ў творчасці. Добры час для абароны сваіх ідэй і дасягненняў.

■ Песню бярыце з сабой

## Прызнанне ў любові Бацькаўшчыне

**Валерый Іваноў — рамантык па натуры. І яго творы прасякнуты жыццядзейным рамантычным духам. Песня «Тапаліны звон» кранальна гучыць і на далёкім амерыканскім кантыненце, выклікаючы ў рускамоўным асяроддзі (тэкст перакладзены з беларускай мовы) трапяткія перажыванні. Па-юнацку бунтарская абуджанасць таленавіта перададзена ў вакальным творы «Каханая». А песні «Гуляць дык гуляць» (другая назва «Сёння ў нашай хаце свята») і «Раз ды разок» адразу прыйшліся даспадобы нашаму прагнаму да спеву люду, і яны хутка фальклярызаваліся.**

Лірыка-рамантычная настроенасць кампазітара разнастайна ўвасобілася ў аркестравых, вакальна-сімфанічных і камерных творах. Асаблівую ўвагу ён звяртае да роднай зямлі, да любай з дзяцінства мясціны — вытоку высакароднай духоўнасці кожнага грамадзяніна-патрыёта. Ёй прысвечаны цыкл п'ес для аркестра народных інструментаў «Зямля бацькоў». А на памежжы тысячагоддзяў, калі найбольш абвострана ўспрымаліся з'явы рэчаіснасці і глыбакадумна асэнсоўвалася роля асабістай прысутнасці ў ёй, Валерый Іваноў напісаў песні на вершы Кастуся Цыбульскага «Зямля бацькоў» і «Бацькоўскі зруб». У іх — і прызнанне ў любові Бацькаўшчыне, і споведзь перад ёй, і прысяга на вернасць.

### ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ

*Верш Кастуся ЦЫБУЛЬСКАГА*

*Музыка Валерыя ІВАНОВА*

У час самотнага дажджу
І ачышчальных перуноў
Табе прызнанне я шапчу:
«Мая навек, Зямля бацькоў».

*Прыпеў:*
Мая няспетая вясна,
У ручаях і жураўлях.
Са мной у радасці і снах
Зямля бацькоў, сыноў зямля.

У час гаючае расы,
Світальных белых туманоў
Я прызнаюся, вечны сын
Тваіх дарог, тваіх званоў.

*Прыпеў.*

Настане час хвіліны той,
Крыжом вярнуся на клады.
Вякамі будуць нада мной
Кружыць буслы*, кіпець сады.

*Прыпеў.*

* *У выкананні ансамбля «Сябры» гучыць «У салаўях кіпець сады».*



Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН





Рубрыку вядзе Дунька ШЫП.

## АНЕКДОТ

Жонка пасылае мужа ў краму.
— Ты паглядзі, якая завіруха! — упарціцца ён. — Добры гаспадар сабаку з хаты не выганіць!
— Дык я і не выганяю — без Тузіка сёння сходзіш.

**Даслала Тамара БАРАДЗЁНАК,** *г. п. Ушачы.*

Васіль ТКАЧОЎ

## ВЫЛЕЧЫЎ...

Іван Сідаравіч сабраўся ў бібліятэку. Заадно, «каб парожнім не швэндаўся», атрымаў ад жонкі заданне зайсці ў краму.

На лаве ля пад'езда сядзеў мужчына ў пакамечаным касцюме і акулярах з рознымі па колеры шкельцамі. Прычым адно з іх было пабіта.

— Мужчына, пачакай, — няўпэўнена абапіраючыся адной рукой на лаву, а другой ловячы паветра, — папрасіў «акулярык». — Ты мяне зразумееш... Я ветэрынар... Жонка, гадаўка, забрала ўсе грошы і з'ехала ў вёску...

— Ну-ну, — суха адказаў Іван Сідаравіч, але хаду затрымаў.

— А я ўчора, звэлхаў двух парсюкоў. Выпіў, вядома, а сёння хварэю. Ты павінен мяне зразумець...

— Дык што вам трэба? — спытаў Іван Сідаравіч і, не доўга чакаючы адказу, працягнуў хвораму дзесяць тысяч.

— Дзякуй! Я ў даўгу не застануся! — паабяцаў той.

...Назаўтра Іван Сідаравіч з жонкай выбраліся ў горад. Апрануліся па-святочнаму, выйшлі на ганак. На лаве сядзеў усё той жа мужчына ў пакамечаным касцюме. Цяпер да дужак акуляраў была прывязана гумка, пабітае шкельца выпала наогул.

— О! Я цябе чакаю! — памкнуўся насустрач ён. — Ты ж мяне вылечыў, помніш? Пахмяліў... Я ў даўгу не магу застацца. Хадзем, пачастую!

Твар Івана Сідаравіча запунсавеўся. Жонка спачатку страціла мову, а затым прашыпела:

— Ну і сябрук у цябе! Дакаціўся!..

— Ды я... Я не піў... — замэкаў Іван Сідаравіч, але пад строгім жончыным позіркам змоўк.

Затое «ветэрынара» было не спыніць:

— Ты бабу не слухай. Мая... усе грошы хапнула... А я сёння звэлхаў... І на заўтра заказ маю...

Жонка пацягнула Івана Сідаравіча за сабой, аднак мужчына ў акулярах не адставаў ад іх. Яго «сёння звэлхаў», «пойдзем вып'ем...» чулася здалёк. Людзі азіраліся... Таму Іван Сідаравіч нарэшце закрычаў:

— Ды не п'ю я-я-я!!!

— А як тады з табой разлічыцца? — не мог зразумець «ветэрынар». — За дабро ж трэба плаціць дабром?

Аднак Іван Сідаравіч быў ужо далёка...



Нарэшце, Клаўчын арол у краму паляцеў

Аляксандр КАРШАКЕВІЧ.

## МІМАХОДЗЬ

- Калі цябе пачынае адольваць склероз, час брацца за мемуары.
- І тыгр любіць антылопу, калі есць яе.
- У родным калектыве ён адчуваў сябе, як Архімед у ванне: ледзь пераадольваў выштурхоўваючую сілу.
- Не хвалі работніка за тыя якасці, якіх ты не знаходзіш у сабе. Гэта небяспечна для тваёй кар'еры.
- Калі ты дасягнуў поспеху — гэта заслужаная ўзнагарода. Калі тое ж самае атрымалася ў калегі — гэта халява!..
- Калі недахопы артыстычна выпінаць, яны становяцца станоўчымі якасцямі.
- З законам часцей сутыкаецца той, хто імкнецца яго абысці.

**Заўважыў Міхаіл УЛАСЕНКА,** *г. Горкі.*

## Вясёлы слоўнік

**Абабраць** — злавіць бабра.
**Аблюбаваць** — ажаніцца з Любай.
**Гумар** — прыхільнік жуйкі.
**Даймаць** — прасіць штосьці ў маці.
**Закранаць** — закрываць кран.
**Кавалак** — аматар кавы.
**Крыжаванка** — могілкі.
**Марылка** — летуценніца.
**Матляць** — брыдкасловіць.
**Небарака** — той, хто не ходзіць у бар.
**Пад'ёмнік** — прапаршчык.
**Памылка** — пральная машына.
**Папсаваць** — слухаць сучасную музыку.
**Паядынак** — застолле.
**Перапалка** — шлагбаум.
**Пітон** — п'янтос.
**Правадыр** — ДАІшнік.
**Салон** — аматар сала.
**Самацёк** — час.
**Стрыжань** — цырульнік.
**Трыбунал** — лектар.
**Трыбух** — трыа барабаншчыкаў.
**Хахаль** — весялун.
**Цягнік** — злодзей.

**Заўважыў Міхась ДУБОВІК,** *в. Арэшкавічы, Бярэзінскі раён.*

## ПАГАСЦІЎ

*З дня народзінаў Ігната*
*Ясь вярнуўся пазнавата.*
*Не паспеў за стол прысесці.*
*— Бабка, — просіць, — дай што з'есці!*
*— Цябе ж клікалі ў госці?*
*(У той злосці поўны косці)*
*— А на стол — адны шы-шы?*
*— Не, старая, не грашы:*
*Страў было — якіх заўгодна!*
*— А чаму ж тады галодны?*
*— Ды мая віна тут, люба:*
*Я забыўся дома зубы!*

**Мікола КАРАЛЁЎ,** *г. Гродна.*



— А ці не маглі б вы прачысціць акенца і выехаць са снегам са двара.

Вікенцій ПУЗАНКЕВІЧ.

Уладзімір ЕРМАЛАЕЎ

## СА СТАРОГА СШЫТКА

- ✓ Дзякуй богу, што сэксуальная рэвалюцыя не скончылася вайной.
- ✓ Вецер у галаве ніколі не бывае спадарожным.
- ✓ Калі чалавеку адкрыць вочы, тады яму цяжка закрыць рот.
- ✓ Начальнік задумаў пачаць паскарэнне з разгону. Разагнаў не ўсіх...
- ✓ Каб стаць аптымістам, трэба прыняць рост цяжкасцяў за цяжкасці росту.
- ✓ Для запявалы галоўнае — голас, для падпявалы — слых.
- ✓ Як толькі завострыш пытанне, адразу раяць закругляцца.
- ✓ Маленькія падарункі ўмацоўваюць сяброўства, вялікія — карупцыю.
- ✓ Яшчэ невядома, як лёгкія на пад'ём пакажуць сябе на спуску.

# «ТРАШЧЫ, НЕ ТРАШЧЫ — УЖО ПРЫЙШЛІ ВАДОХРЫШЧЫ»

**19 студзеня праваслаўнае насельніцтва Беларусі адзначае вялікае свята — Вадохрышча, Кшчэнне, або Богаяўленне**



**Па гарызанталі:** 1. Дзень святога Апанаса, ці ... Прысвятак беларускага народнага календара, які адзначаўся 31 студзеня; з гэтага дня гусей пачыналі карміць збожжам. 3. Курыца, якая выседжвае куранят; пад яе падкладвалі лапкі з ялінак, якімі на Вадохрышча агароджвалі палонку, каб больш было куранят. 7. «... лёдам моцна скута,\\Ды працы тут адна мінута.\\ Палонку дзядзька прасякае,\\А Кастусь, радасны, чакае». З паэмы «Новая зямля»(«Каляды») Я. Коласа. 8. Лішні клопат. 10. З'яўленне свяціла над гарызонтам; пажадана было на Вадохрышча купацца ў палонцы да ... сонца, каб ачысціцца ад грахоў. 12. Узвышанае месца ў царкве перад іканастасам. 13. «І ... шапчу ім аб шчасці,\\І цемру зганяю з вачэй». З верша «Мароз» Я. Купалы. 14. Прысвятак, які адзначаўся 22 студзеня; меркавалі: якім будзе гэты дзень, вызначае вераснёўскае надвор'е. 15. Асноўная частка дрэва. 17. Мінеральная фарба. 21. Рака на Блізкім Усходзе, у водах якой, паводле біблейскай легенды, святы, прарок Іаан Хрысціцель хрысціў Ісуса Хрыста (разм.). 22. Хрышчэнскі снег абяцаў урадлівы год, грыбное лета, але чакалася чарвівая ... (прыкм.). 23. ..., ці пасека; ... апырсквалі святой вадой, каб лепш вяліся пчолы. 24. ... — неразімнікі. Так называлі дзень 21 студзеня; надвор'е гэтага дня прадказвала, якім будзе жнівень.

**Па вертыкалі:** 1. На Вадохрышча вельмі сцюдзёна — у жніво будзе вельмі ... (прыкм.). 2. Статуя, якой пакланяліся язычнікі. 4. Бачыць ... далёка, а розум — яшчэ далей (прык.). 5. Тоўстыя бліны; па ім дзяўчаты напярэдадні Вадохрышча варажылі: чыю ... сабака схопіць першую, тая дзяўчына хутчэй пойдзе замуж. 6. Зорная ... на Богаяўленне — ураджай на гарох і ягады (прыкм.). 9. ..., або заручыны. Адзін з падрыхтоўчых этапаў вяселля; у народзе лічылася, што Вадохрышчанскія ... — да шчаслівай сям'і. 11. Асоба, якая сумесна з кім-небудзь з'яўляецца аўтарам твора, адкрыцця, вынаходства. 14. Рух, ход развіцця. 16. ... дзень. Так у народзе называлі дзень 20 студзеня, калі пілі святую ваду і нічога не рабілі. 18. Зімовая павозка. Напярэдадні Вадохрышча ... і вазкі пераварочвалі, каб не даць магчымасці скарыстацца імі вадзянікам. 19. Чырвоны ... . У сялянскай хаце самае пачэснае месца; побач з абразамі тут захоўвалі святую ваду. 20. Найдрабнейшая часцінка хімічнага элемента.

**Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Гусейнік. 3. Квактуха. 7. Палонка. 8. Абуза. 10. Усход. 12. Амбон. 13. Казкі. 14. Піпін. 15. Ствол. 17. Сурык. 21. Ярдан. 22. Капуста. 23. Пчальнік. 24. Емяльяны.
**Па вертыкалі:** 1. Горача. 2. Ідал. 4. Вока. 5. Аладкі. 6. Ноч. 9. Змовіны. 11. Суаўтар. 14. Поступ. 16. «Ланівы». 18. Сані. 19. Кут. 20. Атам.

## Даты Падзеі Людзі

**1024** год — нарадзіўся Ізяслаў Яраславіч (у хрышчэнні Дзмітрый), князь тураўскі, вялікі князь кіеўскі (з 1054), старэйшы сын Яраслава Мудрага. Адзін з укладальнікаў «Праўды Яраславічаў». У 1067 годзе з братамі Святаславам і Усеваладам ваяваў супраць полацкага князя Усяслава Брачыславіча, захапіў яго ў палон. У 1068-м скінуты з пасады ў выніку народнага паўстання. Двойчы з дапамогай нямецкіх і польскіх феадалаў вяртаўся на прастол. Загінуў у міжусобнай барацьбе ў 1078 годзе.



**1736** год — недалёка ад Глазга нарадзіўся Джэймс Уат (ці Ват), які ўвайшоў у гісторыю як стваральнік паравой машыны. Ён прывёў у рух параход Фултана і паравоз Стэфенсона, паклаў пачатак прамысловай рэвалюцыі і вывеў Англію ў сусветныя лідары. На яго надмагіллі змешчана наступная эпітафія: «Памножыў багацце сваёй краіны, павялічыў сілу чалавека і займае слаўнае месца паміж найбольш слыннымі вучонымі і сапраўднымі дабрадзеямі свету». У якасці адзінкі магутнасці Уат у свой час прапанаваў такую адзінку, як «конская сіла», але ў 1882 годзе Брытанская асацыяцыя інжынераў вырашыла прысвоіць адзінцы магутнасці яго імя. Гэта быў першы ў гісторыі тэхнікі выпадак прысваення ўласнага імя адзінцы вымярэння. З яго і пачалася такая традыцыя.

**1952** год — Ірына Васільеўна Новікава, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук (1994), прафесар (1997). Аўтар навуковых прац па праблемах глабалізацыі сусветнай эканомікі і тэндэнцыі сусветнага сацыяльна-эканамічнага развіцця, сучаснай трансфармацыі нацыянальных эканомік, сістэмнай метадалогіі ў эканамічных даследаваннях.

**Было сказана**

**Казімір КАМЕЙША (нар.1943), беларускі паэт, пісьменнік, перакладчык:**

*«Сумленнасці трэба вучыцца ў маленькіх дзяцей, пакуль яны не навучыліся ад нас несумленнасці».*

## НЕ СЯЧЫЦЕ, МУЖЫКІ...

**Работнікі Аршанскай міжрайінспекцыі выявілі факт незаконнай высечкі, здзейснены супрацоўнікамі аднаго з прадпрыемстваў Барысава ў лясах першай групы на тэрыторыі Аршанскага лясгаса.**

Аб'ём высечанай драўніны склаў 130 кубаметраў. Такім чынам, шкода навакольнаму асяроддзю была нанесена немалая — на 68,6 мільёна рублёў. Матэрыялы накіраваныя ў Аршанскі РАУС для прыняцця рашэння адносна крымінальнай адказнасці вінаватых.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

К У Л І Н А Р Н Ы Я  Х І Т Р Ы К І

## Новая начынка для піражкоў з бульбай



**Піражкі з бульбай — як гэта звыкла. Цеста для іх можа быць рознае. Усе мы ведаем, як рабіць начынку. Проста адварыць бульбу, растаўчы ў пюрэ, дадаць смажаную цыбулю. Некаторыя дадаюць і зеляніну.**

А паспрабуйце ў пюрэ, апроч зеляніны і цыбулі, дадаць дробна парэзаныя салёныя агурочкі, 1-2 шт., у залежнасці ад колькасці пюрэ. Бульбу саліце зусім трохі, бо агуркі ўжо салёныя. Усё перамяшаць. Гатова! Паспрабуйце хоць бы некалькі піражкоў прыгатаваць так. А цеста можна зрабіць такое: кефір 300—400 мл + 1 яйка + соль і сода па 0,5 ч. л. (без верху, соду гасіць не трэба, у кефіры гэта адбудзецца само сабой) + 2—4 ст. л. алею і мука — колькі возьмеце. Цеста павінна атрымацца мяккае. Замясіць, даць адпачыць хвілін 10, і можна рабіць піражкі і смажыць ў алеі на патэльні.

Ч А С Т У Й Ц Е С Я !

## Кекс-торт «Графіня кухні»



**Смаката з шакаладнымі праслойкамі замест крэму і вільготнымі каржамі з апельсінавым смакам. Класічнае спалучэнне «апельсін-шакалад».**

Спатрэбіцца: *мука (цеста) — 250 г, масла сметанковае (размякчанае, у цеста) — 250 г, цукар (цеста) — 170 г, ванільны цукар (цеста) — 1 пач., крухмал бульбяны (цеста) — 100 г, яйка курынае (цеста) — 5 шт., разрыхляльнік цеста — 10 г, апельсін (сок і цэдра 1-го апельсіна ў цеста, сок 2 апельсінаў для насычэння) — 3 шт., шакалад малочны (для праслойкі) — 150—200 г, глазура (пакупная ці прыгатаваная самастойная: 3 ст. л. смятаны, 3 ч. л. какавы, 3 ст. л. цукру, 1 ст. л. сметанковага масла).*

Цеста робіцца вельмі проста: *усе інгрэдыенты для цеста складваем у міску і ўзбіваем міксерам.*

Бляху засцілаем пергаментам і выкладваем цеста, разраўноўваем. Выпякаем 15—20 хвілін пры 180 °С.

Гатовы бісквітны корж наразаем на роўныя па шырыні палоскі. Калі шырыня палосак будзе 6 см, то і вышыня гатовага торта будзе такая ж. Насычаем корж апельсінавым сокам. Можна дадаць трохі алкаголю для насычэння. Шакалад растапіць на вадзяной лазні. Шакаладу можна ўзяць больш. Добра прамазаць бісквітную палоску шакаладам, накрыць яе наступнай і г.д. Збіраем «пірамідку». Потым кладзём яе на бок і паліваем глазурай. Даём застыць глазуры.

**-2908-**

С А Л О Н  П Р Ы Г А Ж О С Ц І

## Ружавы алей ад цэлюліту

**Натуральны ружавы алей цэніцца на міжнародным рынку даражэй за золата і плаціну, таму што для атрымання аднаго літра эліксіру прыгажосці і здароўя патрабуецца ў сярэднім тры тоны пялёсткаў.**

А ў беражлівым доглядзе за сухой, адчувальнай, запаленай скурай ружаваму алею няма роўных — ён паляпшае тканкавае дыханне, разгладжвае маршчыны, танізуе стомленую скуру.

Змяшайце 12 кропляў эфірнага алею ружы і 100 мл аліўкавага алею. Пасля душу рухамі, якія масажуюць, уціраійце сумесь у праблемныя ўчасткі скуры.

П А Р А Д А К  У  Д О М Е

## Змагаемся з непрыемным пахам у памяшканні

**Думаю, што з праблемай непрыемнага паху ў памяшканні сутыкаўся кожны. Пакаёвыя дэзадаранты, безумоўна, дапамога, але толькі на нейкі час. А ёсць дзейсныя (і пры тым простыя) спосабы вырашэння гэтай праблемы.**

**ВАРЫЯНТ ПЕРШЫ. ХІМІЧНЫ**

Тут нам на дапамогу прыйдзе звычайны шкіпінар, які прадаецца ў будаўнічых крамах. Бутэлечкі вам хопіць надоўга, а каштуе ён нядорага. Для апрацоўкі памяшканняў наліваем 3-5 сталовых лыжак шкіпінару ў вядро з вадой. І праціраем гэтай вадой падлогу. Пах свежасці забяспечаны!

**ВАРЫЯНТ ДРУГІ. ЭКСПРЭС-МЕТАД. ХІМІЧНЫ**

Той жа шкіпінар. Толькі зараз некалькі кропель шкіпінару наліваем у распыляльнік для вады, якім вы карыстаецеся пры прасаванні бялізны. І проста апырскваем памяшканне. Імгненна выдаляе ў пакоі пах ежы, якая гатуецца. У склад шкіпінару ўваходзяць розныя эфірныя алеі, якія атрымліваюцца метадамі экстракцыі з розных частак хваёвых дрэў.

**ВАРЫЯНТ ТРЭЦІ. БЕЗАДХОДНЫ**

Хто б мог падумаць, што самая звычайная бананавая лупіна — выдатны прыродны адсарбент! Але гэта так.

Нам спатрэбяцца звычайныя бананы. Вы іх з'ядаеце, не выкідваючы лупіны ў смеццевае вядро, а проста кладзяце ў такія непрыкметныя месцы, дзе яны могуць паціху гніць і засыхаць, напрыклад, на шафах. Іншыя месцы прыдумаеце самі. І ўсё. Бананавая лупіна паволі гніе, а паветра пры гэтым становіцца чыстым і нават пахне ваніллю. Спяшаюся супакоіць скептыкаў: бананавая лупіна гніе «высакародна» — проста чарнее, скручваецца і не пакідае плям. Счарнела — мяняем на іншую. Такім спосабам дасведчаныя людзі карыстаюцца ў складскіх памяшканнях, проста раскладваючы па кутах бананавыя лупіны, тым самым выдаляючы пахі затхласці і сапсаваных прадуктаў.

**-2909-**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.15 | 17.26 | 8.11 |
| Віцебск | — 9.11 | 17.10 | 7.59 |
| Магілёў | — 9.06 | 17.16 | 8.10 |
| Гомель | — 8.55 | 17.20 | 8.25 |
| Гродна | — 9.30 | 17.42 | 8.12 |
| Брэст | — 9.23 | 17.50 | 8.27 |

## Месяц

***Першая квадра ў 1.46.***
***Месяц у сузор'і Цяльца.***

## Імяніны

***Пр.*** *ВАДОХРЫШЧА (Богаяўленне — Хрышчэнне Гасподняе)*
***К.*** *Марты, Браніслава, Генрыха, Юзафа.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Калі дзяўчына не закусвае гарэлку, цалкам магчыма, што яна на дыеце.**

У пункце прыёму шклотары:
— Вы прымаеце бутэлькі з-пад шатландскага віскі?
Паўза.
— Няма тары, сэр.

**Дзяўчаты, памятайце: пінгвіны — гэта ластаўкі, якія елі пасля 18.00!**

Жонка – мужу:
— У гэтым годзе елку будзем выкідваць 23 лютага ці 8 сакавіка?
— Нішто сабе. А навошта тады нам дабавілі выхадных у маі?



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 26.913. Індэкс 63850. Зак. № 310.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 студзеня 2013 года.